ЗВЯЗДА

25 верасня 1996 г. серада, № 234 (23037)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

РОЗГАЛАС

ПРАБЛЕМА

КАЛІ Ў КРАНЕ НЯМА ВАДЫ...

Значыць, яна адсутнічае па тэхнічных прычынах. Бо, як патлумачылі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі, згодна са спецыяльным загадам Прэзідэнта камунальныя службы павінны ўстанавіць бесперабойнае забеспячэнне насельніцтва вадой (абавязкова гэта датычыцца гарачай).

Ні для кога не сакрэт, што шмат дзе гарачая вада з'яўляецца толькі з пачаткам ацяпляльнага сезона. Зараз сітуацыя змянілася, і мясцовыя ўлады павінны сачыць за паступленнем сродкаў менавіта для набыцця паліва, спадзеючыся ў асноўным толькі на ўласныя магчымасці. Дзяржаўныя датацыі на гэтыя патрэбы амаль не паступаюць, а загад усё ж застаецца загадам. Таму графікі адключэння могуць быць абгрунтаваны цяпер толькі тэхнічнымі прычынамі (аварыямі, заменай састарэлага абсталявання і г. д.). Так, у Мінску зараз дамоў, дзе адсутнічае гарачая вада, налічваецца недзе крыху больш за дваццаць. Напэўна з-за труб, якія ўзарваліся?

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ХОДЗЯЦЬ ЧУТКІ, ШТО...

...У КРАІНЕ СКАРАЧАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ДЗІЦЯЧЫХ САДКОЎ

Цяжкая эканамічная сітуацыя ў краіне адбіваецца амаль на кожным з нас. Не абмінае яна і дзяцей. Таму хваляванні бацькоў, якія маюць немаўлят, наконт таго, ці будзе куды ўладкаваць ім дзіця праз год-два, зусім зразумелыя.

Але, як паведамілі ва ўпраўленні дашкольнага выхавання Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, за апошні год колькасць дзіцячых садкоў у рэспубліцы не зменшылася. Сёння ў краіне дзейнічае 4576 дзіцячых садкоў, з іх 1700 — ведамасных. Цікавасць выклікае наступная тэндэнцыя: калі раней маці стараліся як мага даўжэй трымаць дзіця дома, то цяпер у год з невялікім «хвосцікам» яны ўжо жадаюць адвесці яго ў дзіцячы садок.

Зразумела, што пракарміць дзіця ў дзіцячай установе для сямейнага бюджэту танней, да таго ж і заработная плата не ідзе ні ў якое параўнанне з грашамі, якія атрымлівае маці на дзіця ў дэкрэтным водпуску.

Аднак цяжкае эканамічнае становішча ўсё ж закранула дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Гэта датычыцца ведамасных дзіцячых садкоў. Так, па прычыне ўласнага банкруцтва, прадпрыемствамі былі перададзены на бюджэт мясцовых Саветаў за 4 апошнія гады 988 дзіцячых садкоў, з іх 577 — у 1995 годзе. Праўда, трэба дадаць, што і новыя садкі таксама адкрываюцца: у гэтым годзе сістэма дашкольнага выхавання папоўнілася 30 новабудоўлямі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КАНКУРЭНЦЫЮ «МАКДОНАЛЬДС» СКЛАДЗЕ «БЕЛАРУСКАЕ БІСТРО»

Сёлета ў Мінску з'явяцца пункты хуткага харчавання сістэмы «Беларускае бістро», якія складуць канкурэнцыю рэстаранам «Макдональдс».

Як адзначыў начальнік аддзела арганізацыі грамадскага харчавання Міністэрства гандлю Аляксандр Батура, сёння ў рэспубліцы адбываецца станаўленне новай галіны — сістэмы хуткага харчавання. Назіраецца тэндэнцыя перамяшчэння дзейнасці буйных замежных кампаній, што працуюць у галіне хуткага харчавання, на рынкі дзяржаў, якія развіваюцца. Услед за «Макдональдс» на беларускі рынак прыйдуць іншыя.

У сучасных умовах было б недаравальна не развіваць айчынны бізнес. Міністэрствам гандлю рэспублікі распрацаваны праект праграмы «Беларускае бістро», які сёння разглядаецца Камітэтам па навуцы і тэхналогіях Міністэрства адукацыі. Пасля экспертызы праграма пачне рэалізоўвацца па рэспубліцы.

Ужо ў бягучым годзе з'явяцца першыя кропкі сістэмы «Беларускае бістро». Плануецца, што да 2000 года будуць адкрыты 242 кропкі па ўсёй рэспубліцы, дзе меню складаецца выключна са страў беларускай нацыянальнай кухні: дранікі, клёцкі, піца па-беларуску. 5 кастрычніка ў сталіцы на «Восеньскім кірмашы» ў наведвальнікаў будзе магчымасць паспытаць нацыянальных страў.

Усяго ж па рэспубліцы да 2000 года будзе адкрыта звыш дзвюх тысяч прадпрыемстваў хуткага харчавання. Гэта дазволіць працаўладкаваць значную колькасць людзей, у першую чаргу маладых, а таксама часткова вырашыць праблему харчавання насельніцтва. Элементы хуткага харчавання ўкараняюцца на прадпрыемствах і ў школах сталіцы.

Што датычыцца рэстаранаў «Макдональдс», то, паводле слоў спадара Батуры, гамбургеры і чызбургеры ў кожным з іх змогуць паспытаць за дзень 6-7 тысяч наведвальнікаў.

Жанна КАТЛЯРОВА.

У САМАГУБСТВАЎ НЕ ЖАНОЧЫ ТВАР...

Невясёлыя лічбы: як паведамілі «Звяздзе» ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу, толькі за мінулы жнівень на Беларусі адзначана 346 выпадкаў суіцыду. Усяго ж за восем месяцаў гэтага года добраахвотна развіталіся з жыццём 2421 наш суайчыннік, альбо на 152 чалавекі больш, чым за аналагічны перыяд летась.

Як сведчаць шматгадовыя назіранні, у сярэднім на адну самазабойцу-жанчыну ў нас прыпадае аж пяць самазабойцаў-мужчын. Што да ўзроставага піку суіцыдаў, то ў жанчын ён адзначаецца ў перыяды ад 55 да 59 і ад 65 да 69 гадоў. Мужчыны, як правіла, добраахвотна ідуць з жыцця маладзейшымі — ва ўзросце ад 35 да 49 гадоў.

Сяргей ГРЫБ.

УРАДЖАЙ-96

ГАСПАДАРКІ ЎБРАЛІ ТРЭЦЮЮ ЧАСТКУ ЗАСЕЯНАЙ БУЛЬБЫ

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання, у цэлым па рэспубліцы зараз убрана бульба з 32,8 тысячы гектараў (28 працэнтаў ад засеянага). Ураджайнасць працягвае павялічвацца, апошні паказчык складае 150,6 цэнтнера з гектара. На Гродзеншчыне — 168,8, Брэстчыне — 164,5. Усяго накапана 494 тысячы тон бульбы. У дзяржаўныя сховішчы ўжо паступіла 32,6 тысячы тон, за межы рэспублікі вывезена 8, а на прамысловую перапрацоўку трапіла 10 тысяч тон.

Што ж датычыцца начных замаразкаў, то, як лічаць спецыялісты Мінсельгасхарча, яны не павінны адбіцца на якасці бульбы.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ДЛЯ ІНВАЛІДАЎ — ТАННЫ БЕНЗІН. АЛЕ Ж НЕ ДЛЯ ЎСІХ

Як паведамляла «Звязда», у выніку павышэння цэн на нафтапрадукты ўстаноўлены фіксаваныя цэны на іх для інвалідаў і бюджэтных арганізацый.

Аднак у спіс тых, хто мае права на атрыманне таннага бензіну, уваходзяць не ўсе катэгорыі інвалідаў. Так, у Мінску набыць літр бензіну А-76 за 2 тысячы 900 рублёў, АІ-92 — за 3 тысячы 100 рублёў, дызельнага паліва — за 2 тысячы 200 рублёў могуць інваліды Вялікай Айчыннай вайны і прыраўнаваныя да іх з ліку ваеннаслужачых, інваліды МУС, КДБ, інваліды вайны ў Афганістане, інваліды чарнобыльскай катастрофы, інваліды дзяцінства і працоўнага калецтва (з парушэннямі апорна-рухальнага апарату), а таксама ўсе Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы.

Як растлумачыла намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях канцэрна «Белнафтапрадукт» Ірына Чыстаполава, гэта — дабрачынная акцыя аб'яднання «Мінскаўтазапраўка». Ільготнае абслугоўванне магчыма, пакуль прадпрыемства будзе працаваць з прыбыткам. У выніку адсутнасці прыбытку фіксаваныя цэны на паліва будуць адменены. Сёння ж прадстаўнікі вышэйпералічаных катэгорый могуць абслугоўвацца на дзвюх аўтазаправачных станцыях, №1 і №15, што знаходзяцца па вуліцы Ляўкова і ў раёне Навінак. Каб не ўзнікала складанасцей пры абслугоўванні, кліентам трэба мець пры сабе пасведчанне інваліда, тэхнічны пашпарт, вадзіцельскае пасведчанне, а таксама асабісты пашпарт. Кліентам выдаецца лімітная кніжка, па якой адпускаецца 60 літраў паліва ў месяц. З усімі пытаннямі можна звяртацца па тэлефонах 221-52-08 і 278-23-07.

Што датычыцца водпуску нафтапрадуктаў па фіксаваных цэнах у гарадах і раёнах рэспублікі, то, паводле слоў начальніка ўпраўлення эканомікі і фінансаў канцэрна «Белхімнафтапрадукт» Анатоля Філонава, гэтае пытанне вырашаецца мясцовымі Саветамі ў адпаведнасці з наяўнымі аб'ёмамі нафтапрадуктаў. У першую чаргу бензін па фіксаваных цэнах адпускаецца бюджэтным арганізацыям аховы здароў'я, адукацыі, аддзела ўнутраных спраў, пажарнай службы, Міністэрства абароны, прадпрыемствам Мінаграпрома. Якія катэгорыі інвалідаў па рэспубліцы могуць набываць танны бензін, вырашаюць мясцовыя ўлады, зыходзячы са становішча ў кожным раёне.

Жанна КАТЛЯРОВА.

ВОСЕНЬ. ЗА МЯЖУ ЛЯТЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПТУШКІ

Адна з апошніх ваколспартыўных навін, якая дайшла да нас з Масквы, была не лепшая, чым, скажам, калі б далі па галаве доўбняй: лепшы баскетбаліст Беларусі 1995 года Валерый Дайнека, які гуляе зараз за сталічны ЦСКА, памяняў беларускае грамадзянства на расійскае.

Зрэшты, мы ўжо паціху пачынаем прызвычайвацца, што з нашай рэспублікі спартсмены, як правіла, уцякаюць. І калі ад'езд біятланіста Майгурава ці барца-«вольніка» Аруджава вялікай нечаканасцю не стаў (яны такія ж карэнныя беларусы, як я жыхар Трынідада і Табага), то «фінт» баскетбаліста здзівіў. Што ж здарылася ў «прыстойным сямействе»? Па словах самога Валеры, ніякіх меркантыльных інтарэсаў ён не праследаваў, аднак ад ілюзій патрыятызму, які сёння нікому не патрэбны, пазбавіўся.

— Выступаючы за зборную Беларусі, я ніколі не патрабаваў грошай, — сказаў спартсмен. — Аднак калі да каманды нікому няма справы, то навошта тады ў ёй гуляць?

Расіяне, як кажуць, не стаялі разявіўшы рот, і змена грамадзянства супала акурат са зменай Дайнекам клуба (у ЦСКА ён перайшоў з маскоўскага «Дынама»), дзе акрамя трохгадовага кантракта хлопцу прапанавалі добрую зарплату, кватэру і іншыя «сродкі першай неабходнасці».

— Адразу скажу, што мы ніяк не падштурхоўвалі Валеру да таго, каб ён змяніў грамадзянства, — сказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік ЦСКА Юрась Юркоў. — Гэта яго ўласнае жаданне, уласны жыццёвы выбар.

— Ці будзе баскетбаліст выступаць за расійскую зборную?

— У бліжэйшыя тры гады не, бо гэта забаронена правіламі. А далей ён вырашыць сам.

— А за беларускую?

— Калі будзе двайное грамадзянства, то так. Ва ўсякім разе, клуб не супраць.

Што і казаць, навіна невясёлая. А калі ўспомніць, што не так даўно памяняў беларускае грамадзянства на польскае баскетбаліст Альшэўскі, а яшчэ траіх — Куля, Крываноса і Мешчаракова — сёння «абходжваюць» у Амерыцы, дык і наогул паганая. Бягуць браткі, бягуць. І з гэтым пакуль што, мабыць, нічога не зробіш. А шкада.

Алесь СІВЫ.

ДЗЯРЖАВА ПА ЗАСЛУГАХ ЦЭНІЦЬ РАБОТУ СВАІХ ЛЕПШЫХ ЛЮДЗЕЙ

Без творчасці і стварэння нікому яшчэ не ўдавалася ўладкаваць жыццё, дастойнае чалавека. Гэтымі словамі пачаў сустрэчу з групай работнікаў прамысловасці, аховы здароўя, дзеячамі культуры і мастацтва рэспублікі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Яна адбылася 24 верасня ў рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы.

«Менавіта працай мільёнаў аб'яднаных агульным лёсам людзей, звязаных адзінымі думкамі і імкненнямі, куецца эканамічная і духоўная сіла нашай Радзімы. Прыемна ўсведамляць, што ля вытокаў гэтай сілы знаходзіцеся вы — прадстаўнікі самых розных прафесій, якія паставілі свой талент, свае веды і ўменні, прафесіянальнае майстэрства на службу маладой беларускай дзяржаве», — падкрэсліў Прэзідэнт.

За вялікі ўклад у развіццё і прапаганду выяўленчага мастацтва і актыўную грамадскую дзейнасць мастаку-жывапісцу Віктару Грамыку і мастаку-скульптару Акіму Курачкіну Аляксандр Лукашэнка ўручыў медалі Францыска Скарыны. Гэтай жа ўзнагароды за высокія дасягненні ў развіцці беларускай нацыянальнай харэаграфіі была ўдастоена мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» Валянціна Гаявая. Яшчэ адзінаццаці выдучым спецыялістам у галіне прамысловасці, аховы здароўя, адукацыі і мастацтва прысвоены ганаровыя званні заслужаных работнікаў у сваіх галінах.

Сардэчна павіншаваўшы прысутных з заслужанымі ўзнагародамі, пажадаўшы ім творчых поспехаў у далейшым, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сустрэча праходзіць у няпросты для краіны час. Паводле яго слоў, намаганні кіраўніцтва рэспублікі накіраваны на хутчэйшае пераадоленне складанай сітуацыі, на ўсямернае павышэнне дабрабыту і культуры беларускага народа. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, менавіта гэтай мэце служыць нядаўна разгледжаная на рэспубліканскай нарадзе праграма развіцця Беларусі да 2000 года, якая ў кастрычніку будзе апублікавана.

Кіраўнік краіны з усёй пэўнасцю заявіў, што «ў Беларусі будзе пабудавана свабоднае, прававое, дэмакратычнае грамадства з сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай, якая б улічвала інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва рэспублікі». «І ніхто нас з гэтага шляху не саб'е, якія б сілы гэтага ні жадалі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Гэты аптымізм грунтуецца, паводле слоў кіраўніка краіны, на жаданні і імкненні беларускага народа жыць у міры і згодзе, накіроўваць сваю энергію не на разбурэнне, а на стварэнне.

Ігар РУБАН, БЕЛТА.

АФІЦЫЙНА

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 379 АБ РАСШЫРЭННІ ПРАВОЎ МІНІСТЭРСТВА ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У мэтах павышэння эфектыўнасці кіравання Міністэрствам прамысловасці работай падведамных прадпрыемстваў і арганізацый па пераадоленню імі фінансавага крызісу, забеспячэнню стабілізацыі прамысловай вытворчасці ПАСТАНАЎЛЯЮ:

1. Прадаставіць Міністэрству прамысловасці права:

1.1. Ажыццяўляць дзейнасць па стварэнню падведамнымі прадпрыемствамі з удзелам іншых юрыдычных асоб, у тым ліку заснаваных на недзяржаўных формах уласнасці, галіновых фінансавых арганізацый у выглядзе акцыянерных таварыстваў, кантрольныя пакеты акцый якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці;

1.2. Выкарыстоўваць да 15 працэнтаў сродкаў інавацыйнага фонду Міністэрства для фінансавання галіновых работ у галіне маркетынгавых даследаванняў, рэкламна-выдавецкай дзейнасці, інфармацыйнага забеспячэння, стандартызацыі, павышэння якасці прадукцыі, а таксама пошукавых работ эканамічнага характару;

1.3. Заключаць кантракты з кіраўнікамі падведамных прадпрыемстваў без узгаднення з Міністэрствам па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі.

2. Прадаставіць Міністру прамысловасці права:

2.1. Устанаўліваць кіраўнікам прадпрыемстваў, якія забяспечваюць рост паказчыкаў работы ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, надбаўкі да службовых акладаў у памеры да 100 працэнтаў гэтых акладаў, а асобным кіраўнікам прадпрыемстваў, якія маюць прыярытэтнае значэнне ў развіцці галіны, надбаўкі ў больш высокіх памерах.

Пры пагаршэнні паказчыкаў работы прадпрыемстваў адмяняць або змяншаць надбаўкі, устаноўленыя гэтым кіраўнікам;

2.2. Пры неабходнасці ўводзіць па выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў прэміраванне іх кіраўнікоў у памеры да 100 працэнтаў службовых акладаў.

3. Прыпыніць на 2 гады дзеянне абзацаў першага і другога пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 1995 г. № 191 «Аб упарадкаванні распараджэння дзяржаўнай маёмасцю» (Збор указаў Прэзідэнта і пастаноў Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 1995 г., № 15, арт. 331; 1996 г., № 16, арт.389) у частцы ажыццяўлення падведамнымі Міністэрству прамысловасці прадпрыемствамі здзелак па залогу асноўных фондаў пры заключэнні імі крэдытных дагавораў.

4. Да завяршэння работ па рэфарміраванню органаў кіравання прамысловым комплексам павялічыць колькасць цэнтральнага апарату Міністэрства прамысловасці на 27 адзінак з утрыманнем іх за кошт сродкаў пазабюджэтных крыніц.

5. Увесці ў састаў Валютна-крэдытнай камісіі Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь Міністра прамысловасці Харлапа А. Д.

6. Абавязаць органы дзяржаўнага кіравання ўзгадняць з Міністэрствам прамысловасці праекты нарматыўных актаў, якія датычаць работы прамысловых прадпрыемстваў.

7. Вызваліць Міністэрства прамысловасці ад выплаты дзяржаўнай пошліны з іскавых заяў, якія падаюцца ім у гаспадарчыя суды Рэспублікі Беларусь.

8. Гэты Указ уводзіцца ў дзеянне з дня яго падпісання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

23 верасня 1996 г.
г. Мінск.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

А РАХУНАК, АТРЫМЛІВАЕЦЦА, ЗУСІМ НЕ СПЕЦЫЯЛЬНЫ

Учора Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь засяродзіў увагу выключна на заканатворчай дзейнасці. Не адбылося нават традыцыйнага раздзела «Рознае». Павіншаваўшы свайго спікера Сямёна Георгіевіча Шарэцкага з 60-годдзем, парламент адразу ж пачаў разглядаць бягучыя пытанні парадку дня другой сесіі.

Першым быў пастаўлены на абмеркаванне праект закона «Аб унясенні змяненняў у Закон «Аб унутраным дзяржаўным доўгу Рэспублікі Беларусь». Выступаючы з тлумачальным словам, намеснік міністра фінансаў Аляксандр Голаў зазначыў, што прапануемыя папраўкі абумоўлены неабходнасцю ўліку палажэнняў дзеючай Канстытуцыі і законаў, а таксама ліквідацыяй супярэчнасцей паміж асобнымі артыкуламі самога закона. Дэпутаты прыслухаліся да слоў намесніка міністра фінансаў і адобрылі праект.

Было вырашана і пытанне, якое асабліва турбуе былых супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў СССР, якія некалі служылі ў Прыбалтыцы, а пасля аднаўлення дзяржаўнасці Літвы, Латвіі і Эстоніі былі пераведзены ў Беларусь. Пасля папраўкі, якую па прапанове Прэзідэнта дэпутаты ўнеслі ў Закон «Аб пенсіённым забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога саставу органаў унутраных спраў», адпаведныя гады стажу будуць уваходзіць у выслугу гадоў. Калі гэтае пытанне шмат часу не заняло, то абмеркаванне паправак у Закон «Аб адміністрацыйным наглядзе за асобамі, якія былі вызвалены з месцаў пазбаўлення волі» зацягнулася. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу даволі вялікай колькасцю дапаўненняў і змяненняў.

Учора ў першым чытанні быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб іміграцыі», а таксама паўторна абмяркоўваліся папраўкі ў Закон «Аб страхаванні». Нагадаю, што яны былі прыняты Вярхоўным Саветам яшчэ на першай сесіі, але часткова з імі не згадзіўся Прэзідэнт і вярнуў закон на дапрацоўку ў парламент. 24 верасня дэпутаты разгледзелі і дапаўненні ў Закон «Аб статусе дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь».

Наогул, работа сесіі парламента прайшла б роўна і аднастайна, калі б не сенсацыйнае паведамленне, якое зрабіў учора старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў Віктар Ганчар. Яно датычыцца акалічнасцей адкрыцця так званага спецыяльнага рахунку «Рэферэндум-96», на які выканаўчая ўлада прапаноўвала пералічваць добраахвотныя ахвяраванні для правядзення ўсенароднага галасавання. Адказваючы на запыт В. Ганчара аб юрыдычнай абгрунтаванасці адкрыцця такога рахунку, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Тамара Віннікава паведаміла, што «Міністэрства фінансаў па пытанню адкрыцця спецыяльнага рахунку для паступлення добраахвотных узносаў на падрыхтоўку і правядзенне рэферэндуму ў Нацыянальны банк не звярталася». А рахунак, нумар якога быў надрукаваны ў сродках масавай інфармацыі, адкрыты Мінфінам яшчэ ў студзені 1996 года. Сродкі, якія паступаюць на яго, з'яўляюцца даходнай часткай бюджэту, улік паступленняў вядзе само міністэрства. «Мне цяжка ацаніць тое, што адбылося, — сказаў Віктар Ганчар. — Добраахвотныя сродкі фактычна залічваюцца на даходныя крыніцы бюджэту». Да таго ж старшыня Цэнтрвыбаркома заўважыў, што наогул стварэнне рахунку з'яўляецца грубым парушэннем заканадаўства, паколькі сродкі для правядзення рэферэндуму павінны кантраляваць выключна Цэнтрвыбаркомам і паступаць на яго рахунак. Ён заклікаў службы Кантрольнай палаты праверыць гэты факт і аб выніках паведаміць Вярхоўнаму Савету. Віктар Ганчар таксама прывёў яшчэ некалькі фактаў аб парушэнні заканадаўства пры падрыхтоўцы да рэферэндуму. Асабліва складаная сітуацыя назіраецца ў Мінску, у чым, па словах Ганчара, непасрэдна вінаваты мэр горада Уладзімір Ярмошын.

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

СМЕРЦЬ ЦІ ЎСЁ ЖЫЦЦЁ ЗА КРАТАМІ?

Адразу ж пасля таго, як прагучала прапанова аб рэферэндуме, увага грамадскасці была засяроджана ў асноўным на праекце новай рэдакцыі Канстытуцыі. І гэта не дзіўна, паколькі з чатырох прапанаваных Прэзідэнтам пытанняў гэтае будзе мець найбольшыя наступствы. Але ж застаюцца яшчэ тры пытанні, сярод якіх і лёс існавання на Беларусі смяротнага пакарання. Нагадаць аб гэтым і вырашылі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі, якая 24 верасня адбылася ў Нацыянальным прэс-цэнтры. На сустрэчу з журналістамі прыйшлі першы намеснік міністра юстыцыі Ігар Андрэеў і суддзя Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пташнік.

Адразу заўважу, што абодва ініцыятары прэс-канферэнцыі заявілі аб сваёй пазіцыі, паводле якой смяротнага пакарання ў Беларусі быць не павінна. Аднак Ігар Андрэеў свае перакананні падмацоўваў яшчэ аргументамі дзяржаўнай важнасці. Так, ён адзначыў, што пытанне аб адмене смяротнага пакарання ўзнікла не выпадкова. Яно абумоўлена імкненнем Беларусі ўступіць у Савет Еўропы, для чаго адсутнасць смяротнага пакарання з'яўляецца неад'емнай умовай.

Як вядома, на сённяшні дзень у Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь налічваецца каля трыццаці артыкулаў, мерай пакарання па якіх з'яўляецца вышэйшая — расстрэл. Аднак на практыцы найбольш часта такі прыгавор выносіцца па аднаму артыкулу — наўмыснае забойства з абцяжваючымі абставінамі. Напрыклад, у Беларусі за дзесяць апошніх гадоў з 271 прыгавора 250 былі вынесены менавіта за гэтае цяжкае злачынства. У праекце ж новага Крымінальнага кодэкса, які, дарэчы, ужо распрацаваны і перададзены ў Вярхоўны Савет, застаецца толькі адзін артыкул, дзе размова ідзе пра смяротнае пакаранне, — наўмыснае забойства пры абцяжваючых абставінах. Але і тут смяротнае пакаранне можа быць заменена пажыццёвым турэмным зняволеннем. Дарэчы, удзельнікі прэс-канферэнцыі заўважылі, што адразу ж таксама нельга замяніць расстрэл пажыццёвым зняволеннем, паколькі для гэтага трэба стварыць эканамічныя і сацыяльныя ўмовы, падрыхтаваць грамадскую думку. Ды і навуковых распрацовак па гэтай тэме на Беларусі не вядзецца. Таму самі ўдзельнікі гутаркі не выключылі, што рашэнне народа будзе хутчэй эмацыянальным.

Ігар Андрэеў пацвердзіў, што за час свайго кіравання ў якасці Прэзідэнта Аляксандр Лукашэнка не памілаваў ні адну асобу, у дачыненні да якой была вынесена вышэйшая мера пакарання, хаця ўсе справы праходзілі праз яго рукі. А Уладзімір Пташнік паведаміў аб рыхтуемай амністыі, паводле якой пры згодзе Вярхоўнага Савета каля 13 тысяч асуджаных будуць вызвалены.

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

ПРЫВІТАННЕ ЖЫХАРАМ МАСКВЫ

Дарагія масквічы!

Звяртаюся да вас са словамі глыбокай падзякі за той уклад, што Масква, якая валодае значным навукова-тэхнічным, эканамічным і культурным патэнцыялам, уносіць у развіццё беларуска-расійскіх адносінаў. Асабліва прыемна адзначыць, што на сучасным этапе, калі Беларусь і Расія дэманструюць свету імкненне да паглыблення інтэграцыі, прадпрыемствы і ўстановы вашага роднага горада паказваюць яскравыя прыклады ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва са сваімі беларускімі партнёрамі. Актывізацыю гэтага супрацоўніцтва, якое, перакананы, адпавядае карэнным інтарэсам расіян і беларусаў, мы ў многім звязваем з імем мэра Масквы Юрыя Міхайлавіча Лужкова, які адзначае гэтымі днямі свой 60-гадовы юбілей. З'яўляючыся сапраўдным прыхільнікам ідэі збліжэння нашых брацкіх народаў, ён робіць усё магчымае для аднаўлення і развіцця ўзаемавыгадных сувязей паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй.

У расіян і беларусаў такая ступень роднасці, даверу і ўзаемаразумення, якая рэдка бывае і паміж двума блізкімі суседзямі. А гэта — надзейная гарантыя таго, што ўсе цяжкасці на шляху інтэграцыі нашых краін мы зможам пераадолець.

І ў знак шчырай дружбы прыміце ад беларускага народа наш невялікі дарунак вашаму цудоўнаму гораду — першы беларускі тралейбус. Няхай ён, праязджаючы па вуліцах Масквы, сімвалізуе яднанне беларускага і расійскага народаў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

У КАБІНЕЦЕ МІНІСТРАЎ

ПРАЕКТЫ НАКІРАВАНЫ НА ДАПРАЦОЎКУ

Пад старшынствам Міхаіла Чыгіра 24 верасня адбылося чарговае пасяджэнне Калегіі Кабінета Міністраў. На абмеркаванне былі вынесены два праекты — Закона «Аб знешняй працоўнай міграцыі» і Кодэкса гандлёвага мораплавання Рэспублікі Беларусь. Першы з вышэйназваных дакументаў распрацаваны Міністэрствам працы ў адпаведнасці з агульнапрынятымі міжнароднымі прынцыпамі і прызначаны аб'ектыўна рэгуляваць прававыя нормы і адносіны, якія датычаць выезду грамадзян Беларусі за межы рэспублікі з мэтай працаўладкавання, а таксама выпадкаў магчымага прыцягнення іншаземцаў у якасці рабочай сілы на тэрыторыі нашай рэспублікі.

Распрацоўка Кодэкса гандлёвага мораплавання Рэспублікі Беларусь выклікана, на думку яго стваральнікаў, патэнцыяльнай неабходнасцю фарміравання ў будучыні ў рэспубліцы свайго марагаспадарчага комплексу, які, як вядома, ёсць у цэлага шэрага краін, якія маюць аналагічнае з Беларуссю ўнутрыкантынентальнае геаграфічнае становішча. Тым больш, што аб'ектыўная неабходнасць у такім дакуменце ёсць ужо сёння. Вядома, што да 65 працэнтаў рэспубліканскага экспарту-імпарту ажыццяўляецца менавіта грузавым марскім транспартам, афіцыйна дзейнічаюць у нас і пяць экспедыцыйных транспартных марскіх кампаній.

Потым быў зацверджаны прадстаўлены ўзор новага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама разгледжаны некаторыя іншыя пытанні.

Таццяна СМІРНОВА, БЕЛТА.

АДНЫМ СКАЗАМ

● На 1 жніўня ў рэспубліцы **прыватызавана 37 працэнтаў усіх кватэр** дзяржаўнага і грамадскага жылога фонду, агульная плошча якіх — 34,9 мільёна квадратных метраў, кошт — 28,1 мільярда рублёў.

● У студзені—жніўні выпуск **тавараў народнага спажывання** склаў 43,7 трыльёна рублёў, або 99,6 працэнта да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года.

● На пачатак жніўня ў рэспубліцы было **2372 стратныя прадпрыемствы**, ці 25,5 працэнта ад абследаванай іх колькасці.

● На канец жніўня колькасць эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі **склала 4,8 мільёна чалавек**, або 47 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі.

● **Уклады насельніцтва** ў камерцыйных банках на 1 верасня склалі 8,1 трыльёна рублёў, што ў 2,1 раза больш, чым на пачатку мінулагодняй восені.

● Больш за палову прамых **замежных укладанняў** у Беларусь забяспечваюць шэсць краін, у прыватнасці, **найбольшыя аб'ёмы капіталу**, укладзенага ў эканоміку рэспублікі, складаюць грошы нямецкага паходжання.

● Сярэдняя налічаная **заработная плата** рабочых і служачых у жніўні склала 1.332.656 рублёў (у папярэднім месяцы — 1.329.853 рублі).

Яўген ПЯСЕЦКІ

ФОТАСЛОВА

Калі ў чорнае вадзе
не бачна дна,
Калі за здрадаю паўзе
яшчэ адна,
Адхланнем чуецца адно
таропкае:
Пакуты вечныя — жыццё
кароткае.

Калі абцасамі валошкі
струшчаны
І нават птушкі анямець
прымушаны,
Надзеяй чуецца адно
усцешнае:
Жыццё кароткае —
Радзіма вечная.

НА ЗДЫМКУ: камень каля старых кладоў, дзе пахаваны беларускі паэт-каваль Паўлюк Багрым.

НА ДАПАМОГУ БЕСПРАЦОЎНЫМ — ФЕРМЕРЫ

Па-ранейшаму адным з самых высокіх у краіне працягвае заставацца ўзровень беспрацоўя ў Магілёве.

Сёння на ўліку ў Магілёўскім цэнтры занятасці насельніцтва стаяць 7022 чалавекі, альбо 4,4 працэнта ад усяго працаздольнага насельніцтва горада. Чакаецца, што да лістапада ў Магілёве будзе скарочана як мінімум яшчэ 228 чалавек. Тым часам, каб хоць нейкім чынам змякчыць агульную сітуацыю, спецыялісты гарадскога цэнтра занятасці пачалі актыўную дзейнасць па часоваму працаўладкаванню беспрацоўных. У асноўным прапануюцца сельгасработы. Каля 300 магілёўскіх беспрацоўных атрымаюць магчымасць паехаць на ўборку лёну, а яшчэ 250 чалавек — на ўборку буракоў. Сярэдні заробак пры гэтым будзе складаць прыкладна 100 тысяч рублёў штодзень. Цікава, што бадай ці не ўпершыню заяўкі на часовае прыцягненне беспрацоўных паступілі не толькі ад калгасаў і саўгасаў вобласці, але і ад фермераў.

Сяргей ГРЫБ.

КУРСЫ АБМЕНУ НАЯЎНЫХ ВАЛЮТ у камерцыйных банках на 24 верасня 1996 г.

Назва банка	Долар ЗША Купля	Долар ЗША Продаж	Нямецкая марка Купля	Нямецкая марка Продаж	Расійскі рубель Купля	Расійскі рубель Продаж	Тэлефоны
Гал. упр. НБ па Мінску і Мінскай вобл.	18500		12200		3.30		26-64-41
Ф-л 0104 АКБ «Мінскі транзітны банк»	18550	18600	12200	12400	3.30	3.40	372-825
Ф-л № 3 «Гарант» АСКБ «Тэхнабанк»*	18550 5390	18600 5520	12250	12300	3.37	3.44	331-917
АКБ «Аб'яднаны капітал»	18550	18600	12200	12300	3.20	3.45	394-092
СКБ «Тэхнабанк»	18500	18600	12200	12300	3.40	3.44	342-242
Нацыянальны банк РБ (курс для безнаяўных разлікаў)	14650		9691.08		2.71		
Цэнтрабанк Расіі	5389		3555.22		100 бел. р. 27.80		

Інфармацыя прадастаўлена агенцтвам Граўцова.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

Памяняць «зайцоў» на долары

Апошнім часам хадзілі чуткі пра грашовую рэформу, і адначасова са з'яўленнем тых чутак даволі жвава «скокнуў» уверх долар. Людзі занепакоіліся і забегалі са сваімі «кроўнымі», завіравала жыццё каля «абменнікаў». Ну-ну, падумалі мы, цікава, каго там на што мяняюць, калі ў дзяржавы з «зялёнымі» яўна туга? На памяці былі зусім нядаўнія калізіі, калі таксама рэзка ўзрос курс, і народ «ламануўся» у банкі. Колькі тады ўсяго было... Адным словам, захацелася паглядзець, што робіцца зараз. І добрым людзям расказаць.

ЯК ГЭТА РОБІЦЦА

Усё аказалася проста. Калі ў дзяржавы долараў няма, то яна іх і не расходавала. Не прадавалі і банкі з уласнага запасу. Абменныя пункты гандлявалі толькі тым, што скупілі ў насельніцтва. Калі скупілі.

Гэта значыць, трэба станавіцца побач з акенцам і цярпліва перамінацца з нагі на нагу, пакуль не пашанцуе. Адыходзіць нельга ні на крок, інакш знойдзецца нехта, хто скажа, што ты тут не стаяў. Калі ж «пост» заняты ці побач круцяцца «валютныя хлопчыкі», чакаць не мае сэнсу: той, хто стаіць першы, будзе браць доўга. Бо нясуць рэдка і мала — праз гадзіну, а то і дзве па аднаму, па пяць, дзесяць, радзей — дваццаць долараў. Здаюць і па сотні, бывае. Механізм такі: «паперку» толькі досталі з кашалька, а ты ўжо ацаніў яе вартасць і пачынаеш адлічваць эквівалент па курсу. Чалавек здаў, атрымаў свае грошы, а ты адразу падаеш касіру свае — купляеш. Адным словам, канвеер.

Звычайна ўсе ставяцца з разуменнем да такога парадку. «Абменнікаў» па горадзе хапае, і тым, каму трэба пастаяць, каб набраць пэўную суму, замінаць не будуць. Бываюць выключэнні. Пры мне адзін няголены, але прынцыповы таварыш пачаў патрабаваць кнігу скаргаў толькі таму, што трэба было альбо сядзець у чарзе, альбо прыйсці праз колькі часу, бо перад ім паспеў заняць чаргу малады хлапец.

Касірка даволі лагодна патлумачыла, што льготы, на якія спасылаўся той чалавек, на абмен валюты не распаўсюджваюцца, гэта не чарга за хлебам, ёсць нават спецыяльнае пісьмо.

Крыху пагаманіўшы, чалавек сеў збоку і праз нейкі час купіў-такі свае пяцьдзесят «баксаў», якіх яму так не хапала.

КАСІРЫ

Розныя яны, гэтыя дзяўчаты, жанчыны, радзей — хлопцы па другі бок акенца. Тыя, што сядзяць у «абменніках» прама ў банках, цану сабе ведаюць. Доўга з табой не размаўляюць. Няма, і ўсё. Ад іх стрыманасці павявае добра адчувальным халадком. На некаторых з іх людзі скардзяцца, што валюта ёсць, а не прадаюць. Лагаднейшыя за іншых дзяўчаты з пошты або з кабін, што ў буйных магазінах. Здаецца, яны спагадаюць сваім кліентам, не лічаць іх ні валютчыкамі, ні жабракамі. Яны бліжэй да народа, а таму прасцейшыя і дабрэйшыя, ці што? І парадку ў такіх «абменніках» больш. Бо ўсё робіцца добразычліва.

ЧАРГА

Калі зняць з рахунку «валютных хлопцаў», то ў астатнім усё проста. Можна не мучыцца, спрабуючы вылучыць сярод наведвальнікаў пэўныя сацыяльныя групы. Яны тут прадстаўлены ўсе, колькі іх ні ёсць у грамадстве. Калі ўсё ж шукаць нейкія заканамернасці, то яны ляжаць у іншай плоскасці.

Шмат жанчын, асабліва перад абедам ці пасля работы. Нашы жанчыны нават у абед кожны дзень робяць марш-кідкі па магазінах. Да авансу ці зарплаты далёка, вось і дастаюць прыхаваныя на ўсякі выпадак замежныя пяцёркі ці дзесяткі.

Сярод мужчын сустракаюцца «дзелавыя». Такія — жаданыя госці для «абменніка», бо прыносяць стодоларавыя купюры. Казалі, што могуць і тысячу адразу «скінуць». Не ведаю, не бачыў.

Але не яны пераважаюць. Пераважаюць затузаныя жыццём звычайныя мужыкі — і інтэлігентныя на выгляд, і апранутыя больш сціпла. У галаве ў іх адно — як сям'ю пракарміць. Вось і ходзяць са сваімі «зайцамі» ад акенца да акенца, баючыся, каб не з'ела іх інфляцыя ці яшчэ якая трасца.

Прыходзіць моладзь. Нават дзяўчаты. Нават школьнікі. Пры мне, мусіць, сямікласнік здаў дзесятку і пяцёрку.

Так што публіка розная. За адно магу паручыцца: сярод кліентаў абменных пунктаў амаль няма пенсіянераў. Не здаюць, не купляюць. Здаваць няма чаго, купляць няма за што. Той дзед, што патрабаваў кнігу скаргаў, — адзінае, відаць, выключэнне. Пенсіянеры паглядаюць з суседняй чаргі, у якой плацяць за камунальныя паслугі ці пераафармляюць свае сціплыя «кніжкі», сумнымі вачыма, і я ніколі, ні разу не змог вытрымаць такі позірк. Хоць не краў і не рабіў нічога дрэннага.

АХОВА

Думаю, што «абменнікі» няблага ахоўваюцца. Бо на маіх вачах да аднаго з іх, у вялікім гастраноме на праспекце Скарыны, аператыўна падбеглі хлопцы ў форме з аўтаматамі, двое сталі паабапал дзвярэй, а яшчэ двое зайшлі ўнутр. Калі я падняўся па прыступках следам, яны ўжо адвялі ў бок ад «абменніка» нейкага таўсматага хлопца, апранутага з прэтэнзіяй, і пачалі абшукваць.

Каля некаторых банкаў «абменнікі» размясціліся прама на вуліцы. Не паспеў я каля аднаго з іх стаць на «пост», як з банка выйшаў міліцэйскі сяржант і параіў не затрымлівацца. Маўляў, даведаўся, што нічога няма, і ідзі сабе далей. На маё пытанне, чаму ж нельга пачакаць прама тут, тым больш, што наогул нікога няма, ён рэзка адказаў, што тут не зала чакання. Далей дыялог развіваўся прыкладна так:

— Скажыце, а дзе напісана, што нельга пачакаць каля абменніка?

— А дзе напісана, што можна?

— Але ж калі не забаронена, то — дазволена.

— Гэта вам недабіткі з Народнага фронту сказалі. А я вам кажу, што калі не напісана, што можна, значыць — нельга.

Нягледзячы на відавочную абсурднасць сітуацыі, падумалася пра іншае. Сяржант падштурхнуў думку вось у якім напрамку: сапраўды, прававая прастора тут хоць і вызначана, але пакуль што не асвоена. Занадта шмат самадзейнасці.

Сваё тлумачэнне паводзінам ахоўніка даў мужчына, якога той шугануў услед за мною.

— Згаварыліся, — махнуў ён рукой. — Бо так ніхто не бачыць, здавалі валюту ці не. І яны яе ні за што не прададуць нам з вамі, хапае знаёмых. А мо і сабе забяруць...

КІДАЛЫ

Не скажу, многа іх ці мала, але яны ёсць.

За тыя некалькі дзён, калі я адрываў па дзве ці тры гадзіны для паходаў па абменніках, я сустрэў усяго аднаго падманутага. Вось расказ гэтага чалавека сярэдняга веку з тварам тыповага беларуса.

— Ну, спатрэбілася набыць нам тысячу долараў. Нідзе нічога не даюць. Каля аднаго «абменніка», на Даўгабродскай, падышоў да акенца, каля якога я стаяў, хлапец, паглядзеў на табло і пашкадаваў, што слабаваты курс прыёмкі, а ён хацеў здаць вялікую суму. Я і «клюнуў». Давай, кажу, я табе дам больш, чым у «абменніку». Колькі прадасі? Ён кажа: пяцьсот. Папрасілі касірку, яна праверыла, ці не фальшывыя, ён зацiснуў тыя зелянцы ў кулак і мы адышлі да стала ў зале. Усяго два крокі. Я яму адлічыў беларускія па нармальнаму курсу, ён яшчэ папрасіў у мяне калькулятарчык, пералічыў усё, нешта перапытаў. Потым сказаў, што я яму прадаў па добраму курсу і ён можа яшчэ прывезці. Спытаў, дзе я буду чакаць. Я адказаў, што тут. Якраз калі мы гаварылі пра тое, што ён яшчэ зможа прывезці, я забраў у яго са сціснутага кулака тыя самыя долары, што правярала касірка. Каб паспець прывезці да абеду новую суму (бо трэба ж было праверыць), ён пайшоў, а я чамусьці толькі тады пералічыў долары. У мяне у руках было не пяць соцень, а ўсяго тры. Я тут жа выскачыў услед, але таго і след прастыў.

Я чакаў яго паўгадзіны, як дамовіліся, потым яшчэ гадзіну... Што ж, сам вінаваты. Загаварыў ён мяне, адцягнуў увагу.

ВЫСНОВЫ

1. Долары шукаюць і хацелі б купіць у гэтыя дні вельмі многія. Бо баяцца і рэформы, і далейшага росту курса.

2. Купіць цяжка, але можна. Пастаяўшы дзень на «кропцы», можна «зняць» ад 150 да 500 — як пашанцуе.

3. Па-ранейшаму мы з вамі безабаронныя. Перад дзяржавай, якая ў любы момант можа адпусціць долар у «свабоднае плаванне», не паклапаціўшыся пра сацыяльную абароненасць сваіх грамадзян (ды і ўжо адпусціла). Перад свавольствам абслуговага персаналу. Перад крымінальным светам.

А «наверсе», здаецца, не да эканомікі. У іх там ідуць разборкі паміж сабой. Нічога, што людзі не працуюць, а бегаюць адзін за адным па «абменніках». Нічога, што вызначаны Прэзідэнтам «валютны калідор» парушаны. У канцы мінулага тыдня некаторыя банкі пачалі выстаўляць абменны курс 19300 за адзін «зялёны». Нічога, што нацыянальная грашовая адзінка становіцца лягчэйшай. Значыць, жыццё наша даражэе на вачах, а сціплыя ашчаджаныя сродкі гэтак жа на вачах «таюць».

Нічога?

Уладзімір БЯРЭЗІН.

ЯК НАС ДУРАЦЬ

ПЛЯВАЛІ НА ДАВЕРЛІВАСЦЬ ПАРТНЁРАЎ

Правільна кажуць у народзе: колькі вяровачцы ні віцца, а канец будзе. Гэтую спрадвечную ісціну заснавальнікі таварыства з абмежаванай адказнасцю вытворча-камерцыйнай фірмы «Лік» гамяльчане Андрэй Хамянкоў і Сяргей Аўсянікаў ці то не ведалі, ці то ведаць не хацелі: маўляў, мы самі з вусамі, хаця нам усяго па дваццаць гадоў і за плячамі ў нас не вышэйшая эканамічная адукацыя, якая б адыгрывала не апошнюю ролю ў прадпрымальніцкай справе, а ўсяго толькі прафтэхвучылішча. Галоўнае, каб галава варыла, як рабіць грошы сабе, абводзячы вакол пальца сваіх партнёраў.

Да пэўнага часу, а менавіта цэлыя два гады, маладым прайдзісветам гэта ўдавалася — да таго моманту, пакуль ажно пяць дзяржаўных арганізацый, вытворча-камерцыйных і навукова-вытворчых фірмаў, а таксама таварыстваў з абмежаванай адказнасцю рэспублікі не звярнуліся ў аддзел па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС Гомельскага аблвыканкома: «Лік» украў у іх велізарную суму грашовых сродкаў і не мае намеру вяртаць іх. Андрэя Хамянкова міліцыя затрымала ў Сочы, дзе ён грэўся пад павевамі цёплага ветрыку на марскім пляжы, і даставіла ў Гомель у следчы ізалятар. Летась суд прызнаў яго вінаватым па шасці артыкулах Крымінальнага кодэкса, якія пацягнулі ажно на трыццаць гадоў пакарання. А ў канчатковым выніку шляхам паглынання больш строгім пакараннем менш строгага ён пазбаўлены волі на адзінаццаць гадоў з адбываннем тэрміну пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Сяргей Аўсянікаў доўгі час хаваўся ў Санкт-Пецярбургу і Маскве, пакуль яго два месяцы таму не ўзяла за зябры міліцыя. Зараз ён чакае суда — заканамернага фіналу абдурвання сваіх партнёраў.

А пачалі сябрукі сваю злачынную дзейнасць з таго, што, ажыццяўляючы здзелкі па куплі-продажу тавараў і маючы ад гэтага неблагія прыбыткі, паказвалі дулю дзяржаве. Якім чынам? У падатковую інспекцыю прадстаўлялі даведкі аб тым, што «Лік» не займаўся пэўны час ніякай дзейнасцю, сядзеў на мелі. А таму і не плаціць падаткі ў бюджэт. Спецыялісты ж інспекцыі выявілі адваротнае, выкрыўшы падман і прымусіўшы махляроў выконваць закон.

Упэўніўшыся ў тым, што падобныя штучкі з падатковай інспекцыяй у далейшым могуць мець непажаданы вынік, аж да закрыцця таварыства, дырэктар яго Андрэй Хамянкоў распрацаваў злачынны план авалодання маёмасцю даверлівых партнёраў. Для пачатку ён заключыў дагавор з вытворчым аб'яднаннем «Гомельаблнафтапрадукт» на пастаўку яму паўтары тысячы тон бензіну па прымальнай цане і запрасіў з яго ў якасці авансу дзесяць мільёнаў рублёў (справа была ў 1993 годзе), што і было зроблена з боку аб'яднання. Аднак Хамянкоў, як высвілася, і не думаў выконваць дагавор. Палову авансу ён унёс у Гомельскае прадстаўніцтва страхавога таварыства «Кентаўр», заключыў з ім дагавор страхавання крэдыту і ў той жа дзень аднёс яго ў Чыгуначнае аддзяленне АК «Белпрамбудбанка» Гомеля і заключыў з ім дагавор аб атрыманні крэдыту ў 139,5 мільёна рублёў для пакупкі грузавіка «МАЗ».

Атрыманую ж суму вырашыў «крутануць», пералічыўшы яе ў адзін з мінскіх банкаў на разліковы рахунак вытворча-камерцыйнай фірмы «Аманда» з той мэтай, каб тут раслі працэнты за гэтую паслугу. Фірма добра аддзячыла Андрэю Хамянкову, аплаціўшы яму за легкавік «Жыгулі», які стаў яго асабістай маёмасцю. Атрыманы ж ад банка крэдыт у 139,5 мільёна рублёў навыспечаны прадпрымальнік так і не вярнуў. Гэтую запазычанасць таварыства вымушаны быў пагасіць «Кентаўр», з якім «Лік» не разлічыўся, каб замесці свае сляды. Хамянкоў на нейкі час прыпыніў дзейнасць свайго таварыства.

Наступным этапам злачынстваў кіраўнікоў «Ліка» з'явіліся паслугі прадпрыемствам у пераводзе безнаяўных рублёў у рублі наяўныя і свабодна канверсоўную валюту. Прычым без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Вось дзе пагрэлі рукі дырэктар таварыства Андрэй Хамянкоў і яго намеснік Сяргей Аўсянікаў, які на гэты раз перакваліфікаваўся ў галоўнага бухгалтара фірмы, вядома ж, дзеля атрымання найбольшай выгады ад гэтай справы. У выніку цэлы шэраг прадпрымальніцкіх структур і прадпрыемстваў пералічыў на разліковы рахунак фірмы ў камерцыйным банку «Сож» велізарныя сумы (звыш аднаго мільярда рублёў) і стаў чакаць атрымання наяўных грошай. Ды толькі дзе там, бо прагнасць Хамянкова і Аўсянікава ўжо дасягнула апагея.

Усе грошы, пра якія гаварылася вышэй, яны пераправілі на вэксальны рахунак і свае асабовыя рахункі па ўліку чэкавых кніжак, адкуль на ўсю суму атрымалі наяўныя рублі і СКВ і, прысвоіўшы іх, далі драпака, адначасова пакінуўшы з носам падатковую інспекцыю і не выплаціўшы ў бюджэт больш за трыццаць сем мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікам гомельскай міліцыі давялося шмат папрацаваць, каб вывесці на чыстую ваду аматараў лёгкай нажывы. І зрабілі яны гэта на высокім прафесіянальным узроўні.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.



Дарога да Турава. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ГАРАЧЫЯ» ТЭЛЕФОНЫ «ЗВЯЗДЫ» 268-28-72,268-27-51

Ля разбітага серванта

Па «гарачым» тэлефоне з намі звязалася сям'я Чуканавых з горада Оршы. Яны расказалі пра тую даволі складаную сітуацыю, у якую трапіў іх... сервант. Уся справа ў тым, што набылі людзі сабе такую неабходную рэч якраз на другі дзень пасля рэгістрацыі шлюбу — 21 верасня 1994 года.

У мэблевай краме па вуліцы Дамініканскай нагледзелі прыстойную пакупку і потым паехалі на склад забіраць (таму што на вітрыне былі прадстаўлены толькі ўзоры прадукцыі). Там іх ветліва сустрэлі і ў адпаведнасці з выбітым чэкам вынеслі ўпакаваную рэч. Маладыя з радасцю прывезлі набытае дадому, хутка пачалі разбіраць. І выявілі брак: адна планка шыбы была зламана. Першая пакупка аказалася няякаснай.

Прыйшлося везці злашчасны сервант зноў жа на склад. Там была састаўлена адпаведная выпадку дакументацыя і Чуканавы вымушаны былі чакаць, калі ўсё ж адрамантуюць іх рэч. Так і чакаюць дасюль. Нягледзячы на тое, што, здавалася б, тую планку за некалькі хвілін можна замяніць. І куды толькі яны ні звярталіся, нават на прадпрыемства, дзе сервант зрабілі — у населены пункт Сінякоў Клецкага раёна, што на Міншчыне. Адтуль пакуль не паступіла наогул ніякага адказу. На аршанскім мэблевым складзе двухгадовую затрымку з рамонтам тлумачаць адсутнасцю неабходнага матэрыялу.

Круг, як бачым, замыкаецца, і застаюцца ля разбітага серванта пакупнікі, якія не ведаюць ужо, да каго ім звяртацца: і вытворца, і крама застаюцца глухімі да скаргаў. Можа, чакаюць таго часу, пакуль набытая Чуканавымі рэч згніе? Тады, як гаворыцца, і канцы ў ваду...

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ПАНОПТЫКУМ

НЕШТА І ПОГЛЯД

Паноптыкум — гэта збор розных цікавых, незвычайных, смешных рэчаў. Мне даўно хацелася прывесці ў сістэму свае нататкі пра смешныя і сумныя дробязі нашага жыцця. Ды ўсё не знаходзілася рубрыка. Сёння знайшлася. Як гаворыцца, эўрыка...

Такім чынам, без прэтэнзій і без генеральнай лініі. Тым больш, зараз яе даволі цяжка вызначыць. Прашу прабачэння, жывём без цара. У галаве...

***

На нашым офісе з'явілася сціплая чорная шыльда: «Дзяржаўнае прадпрыемства «Дом прэсы». Мне здаецца, назва канторы не адпавядае бягучаму моманту.

Прапаную: «Дзяржаўнае прадпрыемства «Дом пад прэсам». Журналісты павінны быць рэалістамі...

***

Ідзём з жонкай на рынак. Па бульбу. Рынак побач з домам. Бачым, натоўп, крыкі. Стаіць міліцыянер: малады, чырвоны і засмучаны.

Скандалы я люблю. У іх праяўляецца сутнасць чалавека. Што думае, тое і гаворыць. А таксама акрэслівае сваю грамадзянскую пазіцыю.

Сутнасць скандалу: жанчына з вёскі прадае бульбу, за месца трэба плаціць 20 тысяч. Яна, натуральна, не хоча. Дырэктар рынку, адпаведна, хоча. Па колькасці ўдзельнікаў скандалу народ падзяляецца на дзве часткі. Адны за тое, каб не плаціла, другая не лічыць 20 тысяч за грошы.

Жанчына стаіць разгубленая, ледзь не плача. Але адмаўляецца. Галоўны яе тэзіс: бульба свая. Ногі ў яе загарэлыя да чарнаты. Самая звычайная калгасная цётка.

Вярталіся з рынку, падышлі да яе, адзінокай, купілі пяць кіло. Зло, думаю, павінна ўраўнаважвацца дабром...

***

Тут наш рэспубліканскі СНІД-цэнтр выпусціў цікавую рэч. Такая паштовачка, а ўнутры — пардон, прэзерватыў. Ёсць тэкст:

Ты гражданин
И можешь твердо
Меня носить ты гордо.

Па-мойму выдатны вершык. Такі маленькі шэдэўр. Адно незразумела: навошта яго насіць? Тым больш горда...

***

Такое жыццё, што становіцца смешна.

***

Часта чую ад калег: якая розніца, абы плацілі. У сэнсе, усё роўна дзе працаваць, што пісаць і як. Ну, а калі загадаюць напісаць, што Сталін быў добры, тонкі чалавек, любіў людзей, клапаціўся аб іх і г.д.?

Тут заўсёды ёсць пастка. Неразборлівасць вядзе да подласці заўсёды маленькімі крокамі. Адразу так не бывае. Як бы дрыгва: засмоктвае паступова. Дастаткова махнуць рукой — абы плацілі. Ды яно заплацяць і закажуць, але музыка будзе ўжо не твая.

А назад ужо нельга — не пусцяць старыя грахі. Праўда, на гэты конт ёсць выйсце, такое хітрае апраўданне: прыстойны чалавек робіць гадасці неахвотна. Можа быць і так. Але гадасць застаецца, вось у чым справа...

***

Што ёсць дасканалая жанчына? Ну, вядома, прыгожая, з правільнай фігурай, разумная, не вельмі вялікая сцерва і г.д. Але гэта шаблон, стандарт, узор. Іншымі словамі, ідэал.

Аднак што можа быць цікавага ў шаблоне? Ды ён проста нудны. Позірку затрымацца няма на чым, усё гладка, роўна, мёртва. Мне здаецца, распаўсюджанае меркаванне — любяць прыгожых, жэняцца на звычайных — самае натуральнае. Так і павінна быць.

Нічога не зробіш, мужчына шукае нетрывіяльнасць, а гэта ёсць сінонім няправільнасці, нейкай анамаліі. А гэта ўжо цікава, прымушае думаць і шукаць адказы.

Колькі я сустракаў шчаслівых непрыгожых жанчын, верагодна, столькі ж нешчаслівых прыгожых.

Тут, праўда, ёсць іншае меркаванне: непрыгожая будзе менш «выступаць». Ведай сваё месца...

***

Неяк жонка купіла на рынку слоічак хрэну. Прыносіць дадому. Я бяру слоік, там надпіс: «Хрен хороший, столовый».

***

«Я помню чудное мгновенье, передо мной явилась ты...» Нават «двоечники», думаю, ведаюць гэты верш. Ну, на крайні выпадак — пачатак. Напісаў А. С. Пушкін, прысвечана А. П. Керн. Школьная, скажам так, праграма. І ўсё ўсім ясна, «как гений чистой красоты» і далей па тэксту. А хто такая была А. П. Керн? Мякка кажучы, жанчына лёгкіх паводзін. Хадзілі легенды аб яе раманах. Дама, яшчэ раз пардон, перараспала з добрай сотняй мужыкоў. І што ў выніку? «Я помню чудное мгновенье...» Колькі ні тлумач — не растлумачыш. Цяжка ўявіць, што Пушкін не ведаў, хто такая Керн. Вось што такое каханне.

Ды яшчэ відаць тое самае «смецце», паводле Ахматавай, з якога нараджаюцца вершы...

***

Мяне фізічна пужае сур'ёзнасць. Не пераношу кампаній, дзе аб нечым гавораць сур'ёзна. Хочацца пажартаваць і спытаць: «Мужыкі, вы што? Нават смерць і нараджэнне — смешныя. Хоць бы таму: навошта нараджацца, каб потым памерці?» Тут вось самы смех. Адпаведна, і да ўсяго астатняга не трэба ставіцца сур'ёзна.

Не памятаю, хто сказаў, што — самыя вялікія подласці робяцца з сур'ёзным выразам твару. Талстой быў яшчэ больш катэгарычным: пасля недарэчнага жыцця наступіла недарэчная смерць.

***

У мяне ёсць знаёмыя — паэт і празаік. У «Кнігарні пісьменніка» стаяць іх зборнікі, вершы каштуюць 400, проза — 800 рублёў. Такая цана зараз беларускай літаратуры. Можа, яна сапраўдная? Але нават кніжку Быкава можна купіць танна. Бутэлька гарэлкі каштуе больш. Быкаў прызнаны ва ўсім свеце, з часам яго аповесці набываюць выразны бронзавы бляск. І тым не менш.

Другі знаёмы выдаў кніжку ў блізкім замежжы. Нешта крымінальнае, у яркай вокладцы. Пачаў перагартваць. Спатыкнуўся на першай жа фразе, дзе быў ужыты выраз «уютная комната в общежитии». Далей чытаць не стаў. Ну чаму пакой павінен быць абавязкова ўтульным? Нават такія кніжкі можна пісаць на ўзроўні. Так, відаць, таксама нельга. Як можна? Не ведаю.

Трохтомнік Даўлатава каштуе каля 200 тысяч. І яго раскупляюць. Можа быць, уся справа ва ўзроўні таленту?..

Сяргей ШАЎЦОЎ.

ДУМАЙ, НАРОД, ДУМАЙ!

АПОШНІ КРОК

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 года Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь XII склікання, на мой погляд як дэпутата Вярхоўнага Савета і былога старшыні Канстытуцыйнай камісіі, з'яўляецца ўзважанай і прафесіянальна распрацаванай Канстытуцыяй нашай маладой дзяржавы.

Але гэта ні ў якім разе не азначае, што яна не можа быць часткова зменена. Абсалютна дасканалых канстытуцый, ды і законаў наогул у свеце няма. Яны, як прававыя акты, што адлюстроўваюць жыццё, змяняюцца разам з жыццём, узаконьваюць тыя ці іншыя змяненні, якія дыктуе жыццё. Добра, калі гэтыя змяненні своечасовыя, паляпшаюць закон, робяць яго больш зразумелым і даступным для насельніцтва, пазбаўлены суб'ектыўнага падыходу і замацоўваюць прагрэсіўны, а не рэгрэсіўны напрамак развіцця грамадства.

Змяненні і дапаўненні павінны паляпшаць, узбагачаць закон, а не збядняць яго.

Я ўважліва вывучыў праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі), унесены ў Вярхоўны Савет Прэзідэнтам.

Прызнаюся, мне вельмі хацелася знайсці новыя, удасканаленыя нормы права, якія замацоўваюць дэмакратычны лад і намер пабудаваць прававую дзяржаву ў Рэспубліцы Беларусь, хоць у душы я ў гэта не верыў. І інтуіцыя мяне не падвяла. Калі ацэньваць у цэлым праект Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1996 года, дык ён выходзіць за рамкі змяненняў і дапаўненняў, якія могуць уносіцца ў Канстытуцыю праз рэферэндум, што прадугледжана часткай другой артыкула 149 Канстытуцыі 1994 года і часткай другой артыкула 140 праекта Канстытуцыі 1996 года. Таму што гэта практычна новая Канстытуцыя, якая, згодна з артыкулам 83 (п. 2) дзеючай Канстытуцыі 1994 года, павінна прымацца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь. На рэферэндум яна можа выносіцца для ўзгаднення, абмеркавання, а не для прыняцця. Гэтае пытанне павінна разглядацца Канстытуцыйным судом з прыняццем адпаведнага рашэння. І толькі пасля заключэння Канстытуцыйнага суда Вярхоўны Савет павінен быў бы прымаць рашэнне аб правядзенні рэферэндуму.

У прадстаўленым праекце Канстытуцыі можна, на мой погляд, станоўча ацаніць главу 5 «Урад — Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь», дзе ў артыкулах 106—108 дакладна вызначана структура Кабінета Міністраў, выкладзены яго абавязкі. Але Кабінет Міністраў, нягледзячы на прадастаўленае яму права заканадаўчай ініцыятывы і ўскладзеныя на яго функцыі ажыццяўлення выканаўчай улады ў рэспубліцы, застаецца бяспраўным дзяржаўным органам, цалкам залежным ад Прэзідэнта.

У раздзеле I «Асновы канстытуцыйнага ладу» (артыкулы 1—20), раздзеле II «Асоба, грамадства, дзяржава» (артыкулы 21—63) і раздзеле III «Выбарчая сістэма. Рэферэндум» (артыкулы 67—78) за выключэннем некаторых змяненняў, прадэкларaваны артыкулы Канстытуцыі 1994 года. У іх замацоўваюцца такія прававыя нормы і паняцці, як зацвярджэнне правоў і свабод кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, забеспячэнне грамадзянскай згоды, непарушных асноў народаўладдзя і прававой дзяржавы і г.д.

Для кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, думаю, даволі дзіўна гучаць сёння многія палажэнні новага праекта Канстытуцыі, цалкам перанесеныя з Канстытуцыі 1994 года і ігнаруемыя Прэзідэнтам на працягу двух гадоў. Напрыклад:

у арт. 1 сцвярджаецца, што Рэспубліка Беларусь — прававая дзяржава;

у арт. 3 замацавана, што адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ;

у арт. 4 гаворыцца, што дэмакратыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і меркаванняў;

у арт. 5 дэкларуецца, што палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб'яднанні маюць права карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі ў парадку, вызначаным законам;

у арт. 7 запісана, што ў Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права, што дзяржава і ўсе яе органы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі, што прававыя акты ці іх асобныя палажэнні, прызнаныя ва ўстаноўленым законам парадку супярэчнымі Канстытуцыі, не маюць юрыдычнай сілы;

у арт. 33 сцвярджаецца, што манапалізацыя сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадскімі аб'яднаннямі ці асобнымі грамадзянамі, а таксама цэнзура не дапускаюцца;

у арт. 34 дэкларуецца права грамадзян Рэспублікі Беларусь на атрыманне, захоўванне, распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, аб палітычным, эканамічным і міжнародным жыцці, стане навакольнага асяроддзя;

у арт. 52 гаворыцца, што кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, абавязаны захоўваць яе Канстытуцыю, законы і паважаць нацыянальныя традыцыі.

Гэтыя дэмакратычныя нормы права гучаць у Беларусі дзіўна, таму што за час кіравання Прэзідэнта А. Лукашэнкі яны ператварыліся ў пусты гук.

Не адкрываючы вялікіх дыскусій па ўказаных напрамках, думаю, будзе не лішнім коратка канстатаваць рэальнае становішча рэчаў.

Не можа лічыцца прававой дзяржава, у якой не паважаецца права, прызнаецца не сіла права, а права сілы, у якой кіраўнік дзяржавы не выконвае законы і нават Канстытуцыю. 16 Указаў Прэзідэнта прызнаны супярэчнымі Канстытуцыі, але Прэзідэнт з зайздроснай упартасцю ўкараняе іх у жыццё. Прэзідэнт не прызнае законнае рашэнне Вярхоўнага Савета аб даце правядзення рэферэндуму і абсалютна процізаконна навязвае выбаршчыкам сваю дату: 7 лістапада. Парушэнне закона пры правядзенні «Рэферэндуму-96» пачынаецца з першага кроку.

Не можа лічыцца прававым сцвярджэнне, што ўся ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць народу. Згодна з артыкуламі раздзела IV праекта Канстытуцыі, уся ўлада ў рэспубліцы належыць Прэзідэнту. Народ мае права выбіраць Прэзідэнта, але не мае права вызваліць яго ад пасады, не можа змяніць яго правы ці абавязкі без рэферэндуму, а рэферэндум можа назначыць толькі Прэзідэнт. Кола, як кажуць, замкнулася.

Катэгарычная адмова Прэзідэнта прыняць удзел у рабоце палітычных партый і грамадскіх арганізацый рэспублікі, якія спрабуюць дабіцца нацыянальнай згоды ў грамадстве і знайсці выйсце з палітычнага крызісу, гаворыць аб поўнай адсутнасці разнастайнасці палітычных інстытутаў, ідэалогій і меркаванняў. Яны проста ігнаруюцца. Кожнаму чалавеку цвярозага розуму ясна, што іншадумства ці нязгода з пазіцыяй Прэзідэнта выклікае публічную знявагу, прыніжэнне, пастаноўку на ўлік у адпаведных органах, праслухоўванне тэлефонных размоў і цэнзуру перапіскі.

Палітычныя партыі і іншыя грамадскія аб'яднанні практычна не маюць магчымасць карыстацца сродкамі масавай інфармацыі. Такой магчымасці няма нават у Старшыні Вярхоўнага Савета, яго намеснікаў, у дэпутатаў Вярхоўнага Савета, калі яны не падтрымліваюць пазіцыю Прэзідэнта, маюць свой пункт погляду.

Сродкі масавай інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь манапалізаваны Прэзідэнтам, а тыя выданні, якія не пагадзіліся з манапалізацыяй, закрыты ці вымушаны друкавацца за мяжой. Апошнім было закрыта маладзёжнае «Радыё 101,2».

«Поўная, дакладная і своечасовая» інфармацыя паступае да грамадзян Рэспублікі Беларусь толькі з дазволу і па ўказанню аднаго чалавека, і часцей з яго вуснаў, праз тэле- і радыёсетку. Ні пра якую паўнату, дакладнасць і своечасовасць інфармацыі нельга весці і размову.

У шэрагу артыкулаў праекта Канстытуцыі зменены паняцці, што цалкам змяніла іх сэнс у параўнанні з Канстытуцыяй 1994 года.

Напрыклад, у артыкуле 6 прадугледжваецца раздзяленне дзяржаўнай улады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую. Аднак самастойнасці і раўнапраўя галінам улады праект Канстытуцыі не прадастаўляе. Частка другая гэтага артыкула прадастаўляе самастойнасць у межах сваіх паўнамоцтваў не галінам улады, як было раней, а дзяржаўным органам. Вось гэтыя дзяржаўныя органы, на думку аўтараў, павінны ўзаемадзейнічаць паміж сабой, стрымліваць і ўраўнаважваць адзін аднаго. А паняцці ж «галіны ўлады» і «дзяржорганы» неаднолькавыя. Цікава, як будуць ураўнаважваць сябе розныя міністэрствы, дзяржкамітэты і г.д.? Напрыклад, МУС і Міністэрства гандлю, Кабінет Міністраў і Камітэт па спорту.

Асобныя артыкулы выкладзены недакладна, з недагаворваннем. Так, артыкул 17 замацоўвае дзяржаўнай мовай у Рэспубліцы Беларусь беларускую. Рускай і беларускай мовам надае роўны статус. Што гэта азначае? Ці з'яўляецца руская мова ў нашай рэспубліцы дзяржаўнай? Чаму б у такім разе не зрабіць просты і зразумелы для ўсіх запіс пра дзве дзяржаўныя мовы?

Артыкул 19 устанаўлівае, што Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўны герб і Дзяржаўны гімн з'яўляюцца сімваламі Рэспублікі Беларусь.

Але хто зацвярджае гэтыя сімвалы — закон ці Прэзідэнт? У праекце Канстытуцыі пра гэта не сказана. Дарэчы, гэтае пытанне не было вырашана і ў Канстытуцыі 1994 года.

Артыкул 82 не дае яснасці, пры якіх умовах выбары Прэзідэнта ў другім туры галасавання будуць лічыцца здзейсненымі: калі ў галасаванні прынялі ўдзел больш за палову выбаршчыкаў, унесеных у спісы для галасавання, ці тут наогул ніякай нормы не прадугледжана.

Артыкул 83 фактычна прадугледжвае ў рэспубліцы двоеўладдзе на працягу двух месяцаў, таму што пасля выбрання новага прэзідэнта і да прыняцця ім прысягі (2 месяцы) паўнамоцтвы застаюцца ў былога прэзідэнта.

Незразумела, як суды будуць ажыццяўляць правасуддзе на аснове Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёй іншых нарматыўных актаў (артыкул 112). Што гэта за іншыя нарматыўныя акты? Законы, дэкрэты, часовыя дэкрэты, указы, распараджэнні, загады ці нешта яшчэ?

Праект Канстытуцыі не прадугледжвае адмены так званых часовых дэкрэтаў Прэзідэнта, калі яны супярэчаць законам (артыкул 101).

Артыкулы 90—105 главы IV практычна зводзяць да нуля ролю парламента як вышэйшага заканадаўчага органа рэспублікі. Парламент у любы час і практычна па любой прычыне можа быць распушчаны Прэзідэнтам. Атрымліваецца, ён павінен працаваць пад вечным страхам роспуску. Парламент не ў стане пераадолець вета Прэзідэнта і нават не мае права без дазволу Прэзідэнта разглядаць абсалютную большасць законапраектаў.

Артыкул 99 прадугледжвае, што законапраекты, вынікам прыняцця якіх можа быць скарачэнне дзяржаўных сродкаў, стварэнне ці павелічэнне расходаў, могуць уносіцца ў палату прадстаўнікоў толькі са згоды Прэзідэнта ці па яго даручэнню. Практыка работы ў Вярхоўным Савеце паказвае, што такіх законапраектаў больш за 90 працэнтаў. Такім чынам, парламент страчвае сваю сутнасць як заканадаўчая галіна ўлады, ператвараецца ў шырму, якой Прэзідэнт будзе прыкрывацца ў неабходных для яго выпадках пры вырашэнні розных праблем і пытанняў як унутры краіны, так і за яе межамі.

Нават зацвярджаючы бюджэт рэспублікі парламент не ў стане будзе кантраляваць яго выкананне. Кантрольная палата праектам Канстытуцыі ліквідуецца, а ствараецца Камітэт дзяржаўнага кантролю (артыкул 129), які павінен кантраляваць выкананне бюджэту. Але Камітэт дзяржаўнага кантролю фарміруецца і падпарадкоўваецца не парламенту, які зацвярджае бюджэт, а Прэзідэнту.

У артыкулах 125—128 главы 7 раздзела VI пракуратура цалкам падпарадкавана Прэзідэнту. Але і тут, як і ў Канстытуцыі 1994 года, пракуратуры не прадастаўлена права кантролю за дакладным, аднастайным выкананнем законаў парламентам, Кабінетам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта, Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта і г.д. Гэтыя дзяржаўныя структуры аказваюцца па-за кантролем з боку пракуратуры.

У праекце Канстытуцыі прадугледжваецца стварэнне рознага роду пазабюджэтных фондаў (артыкул 132), што, бясспрэчна, стварае ўмовы для рознага роду злоўжыванняў і карупцыі на самых высокіх узроўнях улады.

Канстытуцыйны суд (артыкул 116) фактычна ліквідуецца, гэтак жа як і парламент. Суддзі, што назначаюцца Прэзідэнтам і ім жа адклікаюцца, г. зн. цалкам падпарадкаваны Прэзідэнту, не змогуць прызнаваць яго рашэнні не адпаведнымі Канстытуцыі.

Абгрунтоўваючы неабходнасць унясення змяненняў у Канстытуцыю 1994 года і правядзення ўсенароднага рэферэндуму, А. Лукашэнка спасылаўся на тое, што Канстытуцыя 1994 года не дазваляе праводзіць рыначныя рэформы, што абавязкі Прэзідэнта неабходна канкрэтызаваць і г.д.

Аднак ні пра якія рэформы ў праекце Канстытуцыі размовы не ідзе, ніякай канкрэтызацыі паўнамоцтваў Прэзідэнта няма, ёсць толькі іх бязмежнае пашырэнне.

Артыкул 84 праекта Канстытуцыі прадастаўляе неабмежаваныя правы Прэзідэнту. Прэзідэнт не нясе ніякай адказнасці ні перад кім, нават перад народам Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт не прадстаўляе ніводную з трох дзяржаўных галін улады рэспублікі — ні заканадаўчую, ні выканаўчую, ні судовую (артыкул 6). У той жа час ён з'яўляецца заканадаўцам, выканаўцам і суддзёй, бо праект Канстытуцыі дае Прэзідэнту права выдаваць законы, кіраваць выканаўчай і судовай уладай.

Прэзідэнт узнесены над усімі галінамі ўлады, фактычна нікому непадсправаздачны, выдаваемыя ім дэкрэты, указы, распараджэнні практычна нікім не могуць быць апратэставаны і адменены. Хоць тэарэтычна завуаліравана артыкулы 100—101 даюць магчымасць парламенту адмяніць рашэнне, прынятае Прэзідэнтам, на практыцы ажыццявіць гэта будзе немагчыма.

Артыкул 140 дэкларуе, што раздзелы I, II, IV і VIII Канстытуцыі, калі яны былі прыняты шляхам рэферэндуму, не могуць быць перагледжаны парламентам. Артыкул 77 сцвярджае: рашэнні, прынятыя рэферэндумам, могуць быць адменены ці зменены толькі шляхам рэферэндуму, калі іншае не будзе прадугледжана рэферэндумам. Але ж тут адно сцвярджэнне супярэчыць другому.

У любы час па нязначнай прычыне Прэзідэнт можа ўвесці ў рэспубліцы надзвычайнае становішча, адмяніць афіцыйна шэраг важнейшых правоў і свабод грамадзян. Напрыклад, пры ўвядзенні надзвычайнага становішча адмяняюцца часткі першая і другая артыкула 25, у якіх запісана, што абмежаванне ці пазбаўленне асабістай свабоды магчыма ў выпадках і парадку, устаноўленых законам. Асоба, заключаная пад варту, мае права на судовую праверку законнасці яе затрымання ці арышту. Пры адмене гэтых нормаў права няма больш ніякіх перашкод для ўстанаўлення ў рэспубліцы парадкаў 30-х гадоў СССР.

Артыкул 88 завуаліравана дэкларуе магчымасць датэрміновага адклікання Прэзідэнта з займаемай ім пасады, але практычна гэта становіцца немагчымым. Звяртаю ўвагу на два паняцці. Стойкая няздольнасць па стану здароўя ажыццяўляць абавязкі Прэзідэнта ці дзяржаўная здрада — хто гэта вызначыць? Ці прапанова аб адхіленні Прэзідэнта ад пасады не можа ініцыіравацца ў перыяд разгляду ў адпаведнасці з Канстытуцыяй пытання аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў парламента. Хто ўносіць пытанне аб датэрміновым спыненні паўнамоцтваў парламента? Прэзідэнт.

Змяненне ў Канстытуцыі палажэнняў аб Прэзідэнце можа быць ажыццёўлена толькі на рэферэндуме. Хто можа назначыць рэферэндум? Вядома ж, Прэзідэнт! Такім чынам, кола замыкаецца на адным чалавеку — на Прэзідэнце, які аднаасобна кіруе рэспублікай і сваім любімым простым народам не іначай як з космасу.

У артыкуле 144 абсалютна процізаконна Прэзідэнт прапануе прадоўжыць свае паўнамоцтвы яшчэ на 2 гады і 3 месяцы. Не перавыбірацца нармальным чынам, а прадоўжыць паўнамоцтвы пад шумок, скопам, бо выбаршчыкам прапануецца прагаласаваць адразу за ўсю Канстытуцыю. Глядзіш, можа і не ўбачаць ці не разбяруцца.

Гэтая норма супярэчыць артыкулу 97 Канстытуцыі 1994 года і артыкулу 81 праекта Канстытуцыі 1996 года, дзе дакладна запісана, што Прэзідэнт выбіраецца на 5 гадоў і што адна і тая ж асоба можа быць Прэзідэнтам не больш як два тэрміны, г. зн. 10 гадоў, а не 12—13 гадоў, як гэта плануецца.

Калі народ Рэспублікі Беларусь не ўбачыць ці не разбярэцца ў прапануемым праекце Канстытуцыі сёння і прагаласуе за яго, заўтра ўжо будзе позна! Заўтра ў рэспубліцы ўсталюецца дыктатура. Застаўся апошні крок да яе ўсталявання.

Людзі, задумайцеся над гэтым!

Мечаслаў ГРЫБ, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

СІТУАЦЫЯ

180 СЕМ'ЯЎ АПЫНУЛІСЯ ЛЯ РАЗБІТАГА КАРЫТА. ХТО ІМ ДАПАМОЖА?..

Адной з самых запаветных мараў нашага чалавека заўсёды была мара аб сваёй кватэры, аб сваёй хаце. Нават тых, хто і да гэтага часу туліцца ў інтэрнаце, дзень пры дні «вандруе» па знаёмых (ёсць і такое), жыве на кватэры, не-не ды і наведае гэтая вар'яцкая думка. Між іншым, у некаторых краінах, не такіх ужо і далёкіх, гэтае зусім натуральнае чалавечае жаданне не здаецца такім ужо фантастычным для большасці насельніцтва. У нас жа ўсё, што звязана зараз з жыллёвай перспектывай, здаецца ідэяй фікс. І самае страшнае ў вырашэнні жыллёвай праблемы тое, што часам, напрыклад, бывае так, што і гарадское кіраўніцтва выступае ў ролі той сцяны, праз якую пералезці простаму чалавеку не хапае сіл. Яскравы прыклад таму — будаўніцтва ЖБК-564, мноства членаў якога аказаліся сёння ля разбітага карыта. І шукаюць дапамогі. Праўда, ніхто пакуль ім на дапамогу не спяшаецца. Сутнасць жа справы ў наступным.

ЖБК-564 быў сфарміраваны ў ліпені 1994 года пры Фрунзенскім райвыканкоме Мінска і складаецца з чатырох дамоў. Мінула больш як два гады, і фініш, здаецца, ужо не за гарамі. Аднак склалася абсурдная сітуацыя: людзям, якія выплацілі поўны кошт кватэр, у Мінгарвыканкоме прапанавалі выплаціць яшчэ і нейкую незразумелую індэксацыю. Як аказалася, «Белпраект» распрацаваў методыку індэксацыі сродкаў, якія паступілі на рахункі ўпраўлення капітальнага будаўніцтва і МАПІДа, але своечасова не былі асвоены. У выніку такіх маніпуляцый кошт аднаго квадратнага метра у дамах № 9 і № 11 стане роўны 260 і 250 долараў адпаведна, а ў дамах № 10 і 12 — адпаведна 195 і 175 долараў. (Заўважу: будаўніцтва першых пачалося яшчэ раней. Атрымліваецца, чым раней пачалі асвойваць грошы, тым даражэй будзе каштаваць кватэра! Дзе логіка?) Што датычыцца кошту аднапакаёвай кватэры ў тым жа доме № 9 (а дамы здадзены без аддзелкі), то ён дасягае 10,5 тысячы долараў. Нагадаем, што гэта ў доме, які будуецца ўжо 2,5 года.

Зіма не за гарамі, акты прыёмкі трох дамоў ужо падпісаны, завяршаецца будаўніцтва чацвёртага, аднак да засялення справа не даходзіць. Акт дзяржкамісіі не падпісаны Мінгарвыканкомам, а на ўсе звароты ў УКС аб пераглядзе варыянтаў разлікаў там адказваюць: калі не будзе ўплачана індэксацыя, то замест кватэр будзе прадастаўлены «казённы дом». Відаць, некаторым асобам пры дзяржаве, прабачце, напляваць на тое, што Прэзідэнт сёння спрабуе разблытаць клубок жыллёвых праблем беларусаў. У іх куды больш важная праблема — як мага больш выціснуць грошай з людзей, якія за 2,5 года аддалі ўжо ўсё, што можна было.

Дарэчы, у ліпені 1994 года члены ЖБК-564 унеслі 50 працэнтаў кошту кватэр на разліковы рахунак ЖБК, затым УКБ і МАПІДа, што адпавядала дагавору паміж УКБ і ЖБК-564. Фактычна ж гэта сума пакрыла менш як 10 працэнтаў кошту будаўніцтва. Цяпер людзі задаюцца пытаннем: дзе ж былі грошы да пачатку будаўніцтва? Хто пракручваў іх і атрымліваў працэнты? Было б зусім лагічна, калі б той і заплаціў так званую індэксацыю...

Ігар ГРЫШЫН.

ЗДАРЭННЕ

МІЛЬЁН ЗА ВАЎКА

Менавіта такую прэмію прызначыў калгас імя Куйбышава Быхаўскага раёна за галаву шэрага разбойніка пасля таго, як воўк зрабіў некалькі набегаў на ферму і зарэзаў чатырох цялятак.

Хто толькі не спрабаваў высачыць звера — дарэмна: вельмі ўжо асцярожны быў. Удача ўсміхнулася магілёўчаніну Міхаілу Раманенку, і то на трэцюю ноч засады. Паляўнічаму, відаць, дапамагло тое, што загарэлася балота і пах дыму збіў ваўка з панталыку. Нягледзячы на трапны стрэл — пападанне ў сэрца — у драпежніка хапіла сіл уцячы з месца, дзе шкодзіў. Знайшлі яго раніцай.

У той жа дзень Міхаіл стаў уладальнікам мільёна.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

ХОЧАЦЕ — ВЕРЦЕ, ХОЧАЦЕ — НЕ

ФЯДОРЫНА ГОРА

Фядора Данілаўна Конюхава, вядомая ў рэспубліцы як проста баба Фядора, раскрыла злачынства. Валодае яна, паведамляюць «Магілёўскія ведамасці», не толькі лекарскімі здольнасцямі.

Выехаў да Фядоры Данілаўны госць з Мінска — родны брат Сяргей Данілавіч. І, што называецца, прапаў без вестак. Шукала чалавека міліцыя. Безвынікова.

І было тады бабулі-знахарцы бачанне. Быццам ляжыць яе брат у нейкай закінутай хаціне, глядзіць адным вокам і просіць: ратуй, сястра.

І яшчэ былі Фядоры іншыя бачанні, на падставе якіх яна зрабіла выснову, што брат мёртвы, а забілі яго сужыцелька з дачкой. З гэтым падазрэннем накіравалася ў кампетэнтныя органы. Там паслухалі прадказальніцу, праверылі яе версію. І — развялі рукамі: не трэба, маўляў, нам галовы тлуміць.

А Фядора не сунімаецца. Не дае ёй спакою той самы домік, братава просьба «выратоўвай». Пачала сама пошукі. Прыватнае расследаванне экстрасенса вывела-такі бабулю на хатку, якая снілася. Знайшлі там і нябожчыка. Жанчыны-забойцы вымушаны былі прызнацца ў злачынстве, якое ўчынілі па дурасці. Выпівалі, паспрачаліся, ну і...

Пахавала Фядора брата ў Бялыніцкім раёне, дзе жыве, на сельскіх могілках. Вось такое гора ў Фядоры. А ў Вангі, відаць, з'явілася паслядоўніца.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

ПАМЯЦІ ПАКУТНІКА

Імя Сяргея Міхайлавіча Новіка-Пяюна, паэта, самадзейнага кампазітара, вязня сталінскага і фашысцкага канцлагераў, добра вядома на Беларусі. Нядаўна ў Нацыянальнай бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Мінску адбыўся вечар памяці паэта-пакутніка. Мерапрыемства, наладжанае па праграме абанементных сустрэч тэатра паэзіі «Зніч», супала з 90-годдзем з дня нараджэння Сяргея Міхайлавіча.

Віктар ШНІП.

НАЎЗДАГОН

ПЕРАТВАРЫЦЦА Ў «АДСТОЙНІК» БЕЛАРУСЬ НЕ ПАВІННА

Як паведамілі некаторыя сродкі масавай інфармацыі, неўзабаве міністэрствы замежных спраў Беларусі і Літвы пачнуць абмеркаванне ўмоў міждзяржаўнай дамовы аб рэадмісіі — узаемным вяртанні нелегальных мігрантаў. Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да кіраўніка Дзяржаўнай міграцыйнай службы Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя МАРАЧА.

— Ці лічыце вы, што падпісанне двухбаковай дамовы з Літвой аб вяртанні нелегальных мігрантаў нам сёння сапраўды неабходна?

— Пакуль у нас няма такіх дамоў з Расіяй і Украінай, ніякіх размоў пра падпісанне дамоў аб рэадмісіі з Літвой, Латвіяй ці Польшчай быць не павінна. У адваротным выпадку сітуацыя будзе нагадваць вуліцу з аднабаковым рухам, калі нашы заходнія суседзі будуць «звальваць» нелегальных мігрантаў на Беларусь, а мы накіроўваць іх далей на ўсход і поўдзень (адкуль яны, уласна кажучы, і трапляюць на Захад) не зможам. Такім чынам, Беларусь рызыкуе ператварыцца ў своеасаблівы «адстойнік».

— Перамовы з Расіяй і Украінай ужо вядуцца?

— Так.

— І мы гатовы да канкрэтных крокаў?

— Не. Перш-наперш на тэрыторыі Беларусі варта стварыць цэнтр па часоваму ўтрыманню асоб, якія прыбылі да нас нелегальна. Прынамсі, каб высветліць: хто яны, адкуль і што з імі рабіць.

— Дарэчы, наколькі праблема нелегальнай міграцыі актуальная для Беларусі зараз?

— На мой погляд, тут найбольш дакладна выглядае ацэнка Міністэрства ўнутраных спраў: сёння на тэрыторыі Беларусі нелегальна пражываюць каля 100 тысяч чалавек.

P. S. Як паведаміў «Звяздзе» першы намеснік міністра замежных спраў Валерый Цапкала, пытанне наконт дамовы аб рэадмісіі з Літвой толькі вывучаецца. Па яго словах, умовай для падпісання дакумента стануць дамовы аб узаемным вяртанні нелегальных мігрантаў з іншымі краінамі СНД.

Сяргей ГРЫБ.

У беларускай дэлегацыі няма еднасці

24 верасня прадстаўнікі беларускай парламенцкай дэлегацыі сустракаліся ў Страсбургу з прэзідэнтам Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Лені Фішар, якая пацікавілася, чым яна магла б дапамагчы ў паскарэнні працэдуры прыняцця Беларусі ў СЕ. Як паведаміў Ю. Малумаў, было пацверджана жаданне Беларусі стаць членам Савета Еўропы і запрошаны ў Мінск дакладчыкі ПАСЕ. Потым дэпутаты выказалі сваю думку наконт унутрыпалітычнай сітуацыі ў РБ. Лені Фішар былі перададзены 2 праекты Канстытуцыі, вынесеныя на рэферэндум.

Думкі дэпутатаў падзяліліся. Ю. Малумаў і С. Калякін выказаліся за прыняцце Беларусі без уліку яе ўнутраных праблем, зазначаючы, што членства ў СЕ дапаможа іх уладзіць.

Іншую пазіцыю занялі П. Краўчанка і А. Лябедзька, якія заявілі аб парушэнні дэмакратычных прынцыпаў у Беларусі і прапанавалі ўвязаць іх выкараненне з прыёмам Беларусі ў СЕ. П. Краўчанка перадаў Л. Фішар запрашэнне С. Шарэцкага прыехаць у Беларусь.

Ю. Малумаў заявіў кар. «Звязды», што, на яго погляд, апазіцыя, не знаходзячы падтрымкі ў Беларусі, шукае яе за мяжой. Ю. Малумаву больш важны тэхнічны бок прыняцця Беларусі ў СЕ, і, на яго погляд, прыняццю гэтаму хутчэй можа пашкодзіць пытанне рэферэндуму пра смяротную кару, чым змена Канстытуцыі.

Тым часам Анатоль Лябедзька распаўсюдзіў у Савеце Еўропы заяву ад імя фракцыі «Грамадзянскае дзеянне», у якой гаворыцца аб парушэнні правоў чалавека, парламента і СМІ, а таксама аб дыктатарскіх прэтэнзіях Прэзідэнта Беларусі.

«Стараннямі адной асобы мірная Беларусь становіцца палітычнай Чачнёй», — зазначаецца ў заяве.

Анатоль Лябедзька заявіў, што ён мае намер правесці прэс-канферэнцыю ў Савеце Еўропы на тэму сітуацыі ў Беларусі.

Такім чынам, палітычная нестабільнасць Беларусі можа стаць бар'ерам у далучэнні нашай краіны ў Савет Еўропы. Пытаннем стала нават згода паміж прадстаўнікамі Беларусі ў ПАСЕ наконт умоў членства ў СЕ.

Валер КАЛІНОЎСКІ.
Страсбург.

РЭПАРЦЁР АТРЫМАЎ ЗАДАННЕ...

...сфатаграфавацца ў парку ў выхадны

Хаця бабіна лета не радуе пакуль цяплом, сядзець дома на печы ці на канапе не вельмі цікава. Таму і імкнецца народ прагуляцца па парку. Асабліва, калі дзіця ўжо другі тыдзень просіць пакатаць на коніку.

На жаль, сталічны парк прапануе няшмат атракцыёнаў. Відаць, холад адмоўна ўздзейнічае на механізмы. Вострыя і незабыўныя адчуванні паездкі на «Супер-8» можна зведаць за 10 тысяч рублёў, паляцець у «Космас» і паскакаць на гумавай малпе за 3 тысячы, а паганяць на аўто — за 8 тысяч рублёў. Вось, бадай што, і ўсё. Праўда, яшчэ на коніку ёсць магчымасць пакатацца. На сапраўдным.

Атракцыёнаў не густа. Затое прапаноў сфатаграфавацца на фоне жоўтага лісця ці ў абдымку са штучным мядзведзем або трусом — гэтага дастаткова. Для нецярплівых майстры прапануюць «Палароід»: адзін здымак атрымаеш — 30 тысяч у кішэні недалічышся.

Хто ж згодны пачакаць тыдзень, выкладвае 20—25 тысяч за два каляровыя здымкі. Майстар або па пошце прышле, або самі прагуляецеся зноў у парк. Глядзіш, яшчэ на што-небудзь раскашэліцеся. Хаця б на свой партрэт. Каляровы каштуе 100 тысяч, чорна-белы — палову гэтай сумы. А лепш за ўсё шарж: і танней абыдзецца, і куды больш цікава. Усяго за 25 тысяч рублёў вам намалююць ваш сапраўдны твар. Адкрыюць, так сказаць, вам вочы.

Праўду сказаць, сумна ў восеньскім парку. Плямамі каляровымі свецяцца толькі парасоны міні-кафэ ды гумавыя шары.

Жанна КАТЛЯРОВА.

«КВАТАРАНТЫ»

Гандлюючы ў ларку, жыхарка Магілёва выпадкова пазнаёмілася з трыма каўказцамі. У размове тыя расказалі, што чакаюць тавар, які ў хуткім часе павінны падвезці ў горад. Акрамя таго паскардзіліся, што хацелі б зняць кватэру, але не могуць знайсці [illegible].

Чулая жанчына за умераную плату прапанавала пажыць у двухпакаёвай кватэры [illegible]. Разам з [illegible] дзяўчыны, якіх яны прадставілі сваімі жонкамі. На наступныя суткі, дачакаўшыся вечара, пагражаючы нажом, пастаяльцы звязалі гаспадыню.

Уключыўшы музыку, кватаранты пачалі збіраць сумкі. Калі музыка сціхла, жанчына зразумела, [illegible]

У Кастрычніцкім РАУС Магілёва пацярпеўшая змагла назваць толькі імёны і прыметы пастаяльцаў. Аднак і гэтага было дастаткова для работнікаў крымінальнага вышуку, каб праз нейкі час затрымаць аднаго з «кватарантаў». Ім аказаўся непрацуючы жыхар [illegible]

Віктар КУПРЭЕЎ,
старшы інспектар прэс-групы пры УУС Магілёўскага аблвыканкома.

У ГАСЦЯХ — «ЗОРКА»

Наташа КАРАЛЁВА:

«МНЕ ЗАЎСЁДЫ ПАДАБАЕЦЦА Ў ВАС»

«Зорка» расійскай эстрады Наташа Каралёва нядаўна выступіла са сваім сольным канцэртам у беларускай сталіцы. [illegible]

Пасля заканчэння канцэрта мы ўзялі невялікае інтэрв'ю ў Наташы Каралёвай.

— Якія ўражанні ў цябе засталіся пасля канцэрта ў Мінску?

— Мне заўсёды падабаецца тут выступаць — вашы людзі такія добразычлівыя, цёплыя. Тым больш, вы самі бачылі, што сёння прыхільнікі, якія прыйшлі на мой канцэрт, проста засыпалі мяне падарункамі, сувенірамі і кветкамі. Таму я з нецярплівасцю буду чакаць новай магчымасці прыехаць у ваш цудоўны горад.

— Наташа, асабістае жыццё любой «зоркі» — заўсёды таямніца, у якую вельмі многім хочацца зазірнуць. Якім ты хочаш бачыць свайго паклонніка?

— Гледзячы што разумець пад [illegible] вае: «Я люблю цябе і твае песні». Вось такі паклоннік сустрэўся мне тут, у Беларусі.

— На эстрадзе зараз з'явілася вельмі шмат маладых спевакоў, якім цяжка прабіцца наверх...

— Я так катэгарычна не сцвярджала б. Зараз спяваюць усе — у каго ёсць голас і ў каго няма. Ёсць грошы — няма голасу — абавязкова праб'ешся, знойдзецца, каму падштурхнуць у патрэбны момант. Ёсць голас — няма грошай — сёння ў такой сітуацыі прабіцца на эстраду, заявіць аб сабе сапраўды практычна немагчыма. У мяне бы[illegible]

— [illegible] сапраўдных сяброў, на якіх у любую хвіліну можна абаперціся?

— [illegible] харошых — ма[illegible] ...ўка, Юля, ёй [illegible] ...се ведаюць, [illegible] ...калаева. Цяпер [illegible] ...ерыцы, ад[illegible] ў Маскву. [illegible]

— Што б ты пажадала чытачам газеты «Звязда»?

— Шчасця. Будзьце шчаслівыя!

Размаўляла Вольга РАМАНЮК.

ФЕСТЫВАЛІ

«СТАРЫЯ ПЕСНІ ПРА ГАЛОЎНАЕ»: МАГІЛЁЎСКАЯ ВЕРСІЯ

ПРАЛОГ. Кожны горад багаты па-свойму. «Залата» Магілёва складаецца са шлягераў мінулых гадоў. Прытым сваё багацце магілёўчане не хаваюць, а, наадварот, імкнуцца, каб як мага болей людзей ведалі пра чарговы фестываль «Залаты шлягер». Першы адбыўся год таму, а сёлета арганізатары фестывалю ўжо смела крочаць па вызначаным шляху.

«Старыя песні пра галоўнае» маюць на нашай зямлі свайго слухача. Дырэкцыя Магілёўскай абласной філармоніі першая на прасторы СНД падхапіла ідэю, што лятала ў паветры, а пасля фестывалю «Залаты шлягер» з'явіўся аднайменны фільм на ГРТ. Тады гэта была спроба ўспомніць былыя песні, былых куміраў, для кагосьці — прыгадаць дарагія моманты маладосці.

ЧАСТКА І. ПРА ТВОРЧУЮ МОЛАДЗЬ. Тая музыка ўсё гучыць. Толькі калі год назад у фестывальных канцэртах разам са знаёмымі артыстамі былыя шлягеры выконвалі маладыя спевакі, то зараз для маладых вырашылі правесці асобны конкурс у рамках фестывалю «Залаты шлягер». У ім будуць удзельнічаць эстрадныя выканаўцы ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў. Конкурс складаецца з адборачных праслухоўванняў і фінальнага тура ў Магілёве непасрэдна на фестывалі, дзе выйдуць на сцэну не больш за 20 удзельнікаў. Прытым у многіх краінах СНД ужо вылучылі свайго ўдзельніка ў конкурсе, чакаецца даволі цікавае прадстаўніцтва. Адборачныя праслухоўванні павінны прайсці да 20 кастрычніка, да гэтага тэрміну стане вядома, хто будзе прадстаўляць Беларусь.

Сама ідэя не толькі ў тым, каб зрабіць конкурс рэтра-шлягера. Трэба, каб канцэрты не былі замкнёныя на публіцы пэўнага ўзросту і рэгіёну, каб маладое пакаленне нашых спевакоў адчувала повязь з пакаленнем больш сталым, каб не страціць той пласт культуры, з якога прарасла сучасная эстрадная песня. Каб маладыя адчулі, што заваявалі поўнае права стаяць на сцэне побач са славутымі артыстамі.

ЧАСТКА II. «УГАДАЙ МЕЛОДЫЮ». Падчас правядзення фестывалю, у пачатку лістапада Мінск і Магілёў наведае Валдзіс Пельш. Ды не проста каб наталіцца мілагучнасцю былых песень. Разам з аргкамітэтам фестывалю ён мае намер правесці выязную папулярную гульню на Беларусі, 1 лістапада ў Мінску, 2-га — у Магілёве. Вядома, пры ўдзеле Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь.

На гэты раз гульня будзе будавацца на аснове музычных тэм удзельнікаў фестывалю: Льва Барашкава, Капіталіны Лазарэнка, Іона Суручану, Вадзіма Мулермана, Ірыны Бржэўскай, Шарля Азнавура, Мусліма Магамаева, Юрыя Багацікава, Уладзіміра Трошына, Эдуарда Хіля, Віктара Вуячыча, Тамары Міянсаравай, Марыі Пархоменка, Нэлі Багуслаўскай, ансамбляў «Гайя», «Арэра», «Чырвона Рута». Ужо зараз пачаўся адбор кандыдатаў для ўдзелу ў «беларускіх» гульнях.

Калі вы рызыкоўныя па натуры, можаце паспрабаваць. Каб трапіць у «азартныя меламаны», трэба адказаць на пытанні:

1. Што я ведаю пра гэтых выканаўцаў?
2. Якія песні ў іх выкананні былі папулярныя і ў якія гады? Прымаюцца таксама выразкі з газет, фатаграфіі і іншыя цікавыя матэрыялы пра ўдзельнікаў фестывалю.

Калі адказы на пытанні ўжо ёсць, хуценька сядайце пісаць пісьмо на адрас: 212030, Магілёў, Першамайская, 10, «Залаты шлягер-96», на конкурс «Угадай мелодыю».

Пераможцы з Беларусі будуць запрошаны для ўдзелу ў здымках «Угадай мелодыю» на ГРТ.

Такім чынам фестываль шукае цікавыя формы, каб падоўжыць жыццё старым песням і выклікаць у моладзі цікавасць да песеннага багацця. Арганізатары не могуць пайсці па шляху «Славянскага базара» — прадаваць дарагія білеты. Яны маюць намер рабіць свята для тых, на каго яно перш за ўсё разлічана, а не для тых, хто можа заплаціць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

У СВЕЦЕ — ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

ЧАЧЭНСКІ КАНФЛІКТ ПЕРАНОСІЦЦА Ў ДАГЕСТАН?

Камандуючы групоўкай федэральных войскаў у Чачні генерал [illegible] расцаніў учарашні напад на шасцярых расійскіх вайскоўцаў у Хасаўюртаўскім раёне рэспублікі як спробу перанесці чачэнскі канфлікт на тэрыторыю Дагестана.

Генерал заявіў «Інтэрфаксу», што гэта грубая правакацыя, мэта якой — дэстабілізацыя становішча ў рэгіёне. [illegible]

У НОВЫХ МАСКВІЧОЎ З'ЯВІЛАСЯ ПРАВА ВЫБАРУ

[illegible] пенсіянераў, датацыямі да пенсій і дапамогамі мнагадзетным сем'ям і адзінокім маці.

АСАМБЛЕЯ ААН ПОЎНАСЦЮ АДМЕНІЦЬ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ БЫЛОЙ ЮГАСЛАВІІ

Як паведамлялася, у панядзелак у Нью-Йорку адкрылася сесія Генеральнай Асамблеі ААН. Цэнтральным пытаннем будзе дагавор аб усеагульнай забароне ядзерных выпрабаванняў. [illegible]

РАСІЯ АБАРАНІЛА АЙЧЫННЫХ ВЫТВОРЦАЎ СПІРТНОГА

[illegible]

СІТУАЦЫЯ Ў ПРЫМОР'І ЗАСТАЕЦЦА СКЛАДАНАЙ

[illegible] кам, як абяцаў губернатар Прымор'я Наздраценка, учора не пачаўся. Энергетыкі маюць намер працягваць забастоўку да пагашэння не менш як 70 працэнтаў запазычанасці па зарплаце. Стан 123 галадаючых энергетыкаў пагаршаецца.

ЗЕЛІМХАН ЯНДАРБІЕЎ ТРАПІЎ У БАЛЬНІЦУ

Лідэр чачэнскай апазіцыі Зелімхан Яндарбіеў быў тэрмінова шпіталізаваны [illegible]

СВЯТА ПІВА НА РАДЗІМЕ

[illegible]

13 — ЛІЧБА ШЧАСЛІВАЯ!

[illegible]

Як паведаміла жонка А. Крунявічуса Літоўскаму тэлебачанню, для іх сям'і лічба 13 самая шчаслівая: ажаніліся 13-га, дачка нарадзілася 13-га, білет латарэі купілі 13 верасня, апошняя лічба шчаслівага білета таксама 13.

Паводле паведамленняў радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», «Радыё Расіі» і «Радыё-РОКС».

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Убачыўшы ў кустах пітона, жыхары малазійскага горада Пенанг паклікалі на дапамогу байцоў войскаў грамадзянскай абароны. Калі яны наблізіліся да логава, пітон імгненна кідком заключыў у свае абдымкі аднаго з салдат. І калі б не кваліфікаваная дапамога сяброў, якія з вялікімі намаганнямі разматалі пітона, невядома, чым бы скончылася гэтая схватка. Пітон будзе змешчаны ў мясцовы заапарк.

Асашыэйтэд Прэс

На працягу дзесяцігоддзяў у навучальных установах Італіі праводзіліся апытанні на тэму: кім хоча стаць дзяўчынка? Звычайным адказам заўсёды было: жонкай.

У сярэдзіне 90-х гадоў большасць вучаніц марыць ужо не аб сямейным шчасці, а аб подыуме, прафесіі фотамадэлі. Шэсць з дзесяці. Але мадэлямі з імем і вялікімі ганарарамі становяцца адзінкі. Для іх створана спецыяльная школа, дзе за чатыры месяцы, за 80 вучэбных гадзін і пяць мільёнаў лір, дзвесце будучых «зорак» праходзяць самую разнастайную падрыхтоўку.

«Известия»

Беспрацоўны чэх учыніў узброены напад на сваё былое прадпрыемства. А праз паўгадзіны пасля ўдалага рабаўніцтва ён прыйшоў у паліцыю, здаў украдзенае, зброю, і рашуча запатрабаваў, каб яго пасадзілі ў турму.

Ён на першым жа допыце прызнаўся, што яго проста давялі да крайнасці «здзекі сваякоў і жонкі» і ён хоча адпачыць у турме.

ІТАР-ТАСС

У НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ

ШТО Ў ХВОСТ, ШТО Ў ГРЫЎНЮ

Вось ужо другі тыдзень Украіна жыве выключна з новай грашовай адзінкай — грыўняй. Выкарыстоўваюцца купюры вартасцю у 1, 2, 5, 10, 20, 50 і 100 грыўняў. На апошняй намаляваны партрэт Т. Р. Шаўчэнкі ў казацкай папасе. На астатніх прысутнічаюць іншыя выдатныя, у асноўным палітычныя, дзеячы. Разменнай манетай з'яўляюцца «капійкі». Іх намінал — 1, 2, 5, 10, 25 і 50.

Новую валюту ўвялі з 2 верасня. Да шаснаццатага чысла працягваўся пераходны перыяд, у час якога выкарыстоўваліся і новыя і старыя грошы. Апошнія ўсюды ўзмоцнена мянялі па курсу 100 000 крб за 1 грыўню. У гэты ж час было забаронена павышаць цэны на тавары і паслугі. У асноўным так і было. Затое цяпер гандляры паціху наганяюць упушчанае. Ужо амаль усюды на 5—7 кап. падаражэў хлеб (спачатку была ўстаноўлена цана 65—67 кап. за буханку). Малако было па 54 кап. за літр, цяпер — 65—68 кап. Трымаюцца пакуль цэны на масла — 6 гр. 42 кап., каўбасу вараную — 4 гр. 83 кап, гарэлку — 1 гр. 97 кап. — 2 гр. 20 кап.

Курс долара таксама амаль не павысіўся. Цяпер яго прадаюць па 1 гр. 68 кап. На апошніх таргах на Кіеўскай міжбанкаўскай валютнай біржы за 1 грыўню давалі 3025 расійскіх рублёў і 10.850 беларускіх.

Апошнюю рэформу народ успрыняў па-рознаму. Адны абрадаваліся вяртанню больш прывычных цэн і зачаравальнага звону дробязі ў кішэнях. Другія крытычна пасміхаюцца: да чаго ўсё гэта? Большасць жа настроена раўнадушна-песімістычна. Ад змены купюр іх колькасці не прыбавіцца. Таму, што ў хвост, што ў грыўню — усё адно.

Іван ТУЛІНСКІ.

«МАШАЎ»: НАДЗЕЙНЫ ШЛЯХ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

У Доме дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі пасольства Дзяржавы Ізраіль у Мінску правяло першую сустрэчу клуба «Шалом» («Мір»). Ён створаны для падтрымкі сяброўскіх сувязей і прафесіянальных кантактаў паміж удзельнікамі праграмы «Машаў», што ажыццяўляецца аддзелам міжнароднага супрацоўніцтва пры Міністэрстве замежных спраў Ізраіля. Расказвае Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Дзяржавы Ізраіль у Беларусі Эліяху ВАЛК:

— Наша краіна здаўна ўдзельнічае ў супрацоўніцтве і аказанні дапамогі іншым дзяржавам. Асабліва гэта датычыцца тых галін, у якіх Ізраіль займае вядучае месца ў сусветнай практыцы. Я маю на ўвазе сельскую гаспадарку, медыцыну, навуку і тэхналогіі. З мэтай перадачы свайго вопыту і ведаў у гэтых і іншых накірунках яшчэ ў 1958 годзе ў нас была распрацавана і пачала ажыццяўляцца міжнародная праграма «Машаў». Менш чым за 40 гадоў сваю кваліфікацыю па гэтай праграме ў Ізраілі павысілі звыш 50 тысяч чалавек, а яшчэ звыш 60 тысяч — непасрэдна на месцах у іншых краінах свету.

Адразу, як толькі ў 1993 годзе ў Мінску было адкрыта пасольства Дзяржавы Ізраіль, адным з галоўных накірункаў яго дзейнасці стала ажыццяўленне і разгортванне праграмы «Машаў». Ва ўмовах развалу і крызісу, у якіх апынулася Беларусь, супрацоўнікі пасольства, і ў першую чаргу сам Э. Валк, вырашылі аказаць пасільную дапамогу спецыялістам сельскагаспадарчай вытворчасці рэспублікі. На працягу трох гадоў у Ізраілі прайшлі навучанне 40 чалавек, з іх 32 — па сельскай гаспадарцы. Тры выязныя семінары праведзены ў Мінску. Такім чынам, звыш 100 спецыялістаў Беларусі ўжо на практыцы асвоілі ізраільскі вопыт па лініі праграмы «Машаў».

... На першым пасяджэнні клуба «Шалом» прысутнічалі многія з былых курсантаў. Успамінам іх, здавалася, не будзе канца... Прыгадвалі ўмовы вучобы, сустрэчы, паездкі па старажытнай ізраільскай зямлі. Мелі месца і ўспаміны больш чым шчырыя: напрыклад, Васіль Семянюк, дырэктар Магілёўскага абласнога аб'яднання «Магілёўагароднінаплод», прызнаўся: «Убачыў ізраільскую карову — і мову ў мяне адняло...»

А мы кажам, што нашага чалавека ўжо нічым і не здзівіш!

Праграма «Машаў» будзе пашырацца на Беларусі і надалей. За вопытам у далёкі і таямнічы Ізраіль паедуць яшчэ дзесяткі нашых суайчыннікаў. І, думаецца, вопыт яўрэяў паспрые пошуку выйсця з тупіка, у які трапіла наша маладая суверэнная краіна.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ Ў ГДАНЬСКУ

У Гданьску адбыўся III фестываль нацыянальных меншасцей у Польшчы. Сярод яго арганізатараў — саюз украінцаў у Польшчы, беларускае грамадска-культурнае таварыства «Хатка», саюз нямецкай меншасці ў Гданьску, саюз польскіх татараў і іншыя арганізацыі, якія займаюцца праблемамі нацыянальных меншасцей.

Сёння ў Польшчы жыве каля 650 тысяч немцаў, 450 тысяч беларусаў, 300 тысяч украінцаў, 15 тысяч літоўцаў і г. д. Праблемы іх дзейнасці, супрацоўніцтва з этнічнай радзімай, развіцця і захавання традыцый будуць абмеркаваны ў час фестывалю, які прадоўжыцца некалькі дзён. У яго рамках адбудзецца міжнародная канферэнцыя «Правы нацыянальных меншасцей — тэорыя і практыка», а таксама семінар «Фінансаванне культурных згуртаванняў нацыянальных меншасцей». Будзе арганізаваны паказ фільмаў на гэтую ж тэму, адкрыецца мноства выставак.

І, вядома ж, будзе гучаць шматнацыянальная музыка, будуць вясёлыя танцы, карагоды, гульні, забавы, нацыянальныя стравы, вырабы народных майстроў. У канцэртах прымуць удзел і мастацкія калектывы і выканаўцы з Беласточчыны, вядомая «Маланка» з Бельска-Падляшскага.

А яшчэ на ўрачыстым канцэрце з нагоды адкрыцця фестывалю беларускія песні будзе выконваць Ганна Анташэвіч.

Кар. «Звязды».

НАЛАДЖВАЮЦЦА МАЛАДЗЁЖНЫЯ СУВЯЗІ ПАМІЖ ЛІТВОЙ І БЕЛАРУССЮ

У верасні пачалася своеасаблівая акцыя «знаёмства» (калі можна так сказаць) моладзі беларускай і літоўскай, якая, як мяркуецца, расцягнецца надоўга.

Як адзначыў кіраўнік культурнага сектара беларускай дэлегацыі, у якую ўваходзілі яшчэ эколагі, палітыкі і сацыёлагі, Яўген Калмыкоў, мэта паездкі — успомніць пра тое, што мы ўсё ж суседзі, пасябраваць і паспрабаваць разбурыць штучны бар'ер між краінамі. Семінары на гэтую тэму прайшлі ў Каўнасе, Вільнюсе; у клубах гэтых гарадоў выступілі беларускія музыкі, мастак часопіса «Новая выпь» Аляксей Хацкевіч. Па ініцыятыве беларускай групы літоўскія музычныя гурты запрошаны гэтай вясной у Мінск, а беларускія, магчыма, працягнуць выступленні ў Каўнасе і Вільнюсе. Арганізатары адзначылі, што першыя крокі зроблены паспяхова, і пачатак сяброўству і супрацоўніцтву пакладзены.

Яна САВІЦКАЯ.

ВАКОЛ СПОРТУ

ФУТБАЛІСТ ЗАГІНУЎ ПАД КОЛАМІ

Днямі ў Наваполацку хавалі варатара мясцовага футбольнага клуба «Нафтан-Дэвон» Вячаслава Ігнацюка.

Так здарылася, што малады футбаліст трапіў пад колы аўтамабіля, за рулём якога знаходзіўся нецвярозы шафёр. Смерць была амаль што імгненнай.

Алесь СІВЫ.

XXXII СУСВЕТНАЯ ШАХМАТНАЯ АЛІМПІЯДА

Пройдзена палова дыстанцыі: мы не на шахматных задворках

Роўна палова дыстанцыі была пройдзена шахматыстамі на XXXII Сусветнай шахматнай алімпіядзе на ўчарашні дзень. Сёмы тур аказаўся паспяховым для беларускіх майстроў старажытнай гульні. Мужчыны ўпэўнена абыгралі сапернікаў з Бразіліі — 3:1. Перамогі дабіліся Шульман і Купрэйчык, унічыю звялі свае партыі Аляксандраў і Мачалаў.

Аднаасобным лідэрам сярод мужчын з'яўляецца зборная Расіі. На яе рахунку 21 ачко. У іспанцаў 19,5 ачка і другое месца. Нашы з 17,5 ачка дзеляць 9—15 месцы.

Значна слабей выступаюць беларускія шахматысткі, хоць на гэты раз яны «ўсухую» (3:0) выйгралі ў партугалак. Пераможнае трыо выглядала так: Заяц, Лагвілава, Загорская. З 11 ачкамі зборная займае месца ў трэцяй дзесятцы. А тон тут задаюць каманды Украіны, Грузіі, Расіі і Кітая.

Учора позна ўвечары завяршыўся 8-ы тур. Мужчынская зборная Беларусі сустракалася з першай камандай Арменіі, а жаночая — з Манголіяй.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Закончыў жыццё самагубствам 18-гадовы расійскі бягун на сярэднія дыстанцыі Рыгор Генералаў. У развітальнай запісцы, якую пакінуў спартсмен, ён папрасіў прабачэння ў трэнера і перадаў апошняе прывітанне сваёй дзяўчыне.

*

Аргенцінскі футбаліст Дыега Марадона працягвае праходзіць курс лячэння ад наркотыкаў — ён звярнуўся па дапамогу да вядомага іспанскага нарколага. Праўда, нават самыя аптымісты не вераць у тое, што Марадона ізноў здолее гуляць у футбол.

*

Не менш вядомы капітан англійскага футбольнага клуба «Манчэстэр Юнайтэд» Эрык Кантана заплаціў нядаўна па рашэнню суда 700 долараў штрафу за тое, што прайграўшы на іпадроме грошы, пабіў пад гарачую руку мясцовага бізнесмена. Цікава, што футбаліст, каб не даводзіць справу да суда, прапаноўваў пацярпеўшаму 1500 долараў, аднак апошні адмовіўся.

*

Трагічна скончылася спроба ўзыходжання на Эверэст для французскага альпініста Іва Бушэ і двух непальскіх праваднікоў. Пад нечаканым снежным абвалам загінулі ўсе трое.

*

Колькі ні змагаюцца з ужываннем спартсменамі забароненых допінгпрэпаратаў, усё дарэмна. На гэты раз «злавілі за руку» вядомую румынскую легкаатлетку Алену Моргач. І паколькі за апошні час гэта ўжо трэці такі выпадак з Моргач, вырашана забараніць ёй выступаць на спаборніцтвах пажыццёва.

Алесь СІВЫ.

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск –	6.59	19.03	12.04
Віцебск –	6.49	18.53	12.04
Магілёў –	6.48	18.52	12.04
Гомель –	6.47	18.47	12.00
Гродна –	7.16	19.16	12.00
Брэст –	7.15	19.19	12.04

МЕСЯЦ

Першая квадра 20 верасня

ІМЯНІНЫ

Пр. Сімяона, Фёдара.
К. Уладзіслава, Аўрэліі

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, на большай частцы тэрыторыі рэспублікі дажджы. Тэмпература паветра ў Гродне — 8—10, Брэсце — 10—12, Мінску, Магілёве — 9—11, Гомелі, Віцебску — 11—13 градусаў.

У наступныя двое сутак: 26-га — на большай частцы тэрыторыі, 27-га — па ўсходу пройдуць дажджы. Тэмпература ўначы — 3—8, удзень — 8—13; 27-га па паўднёваму захаду — да 15 градусаў цяпла.

Сядзіба

Выпуск № 332 Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

АСЕННІЯ ЛЕКІ

Восень — пара збору ўсяго выгадаванага. У тым ліку і лекавых культур. Нехта, прадбачу, ускіне брыво — як гэта так, а дзе былі летам? Сапраўды, у чэрвені—жніўні асноўнае «жніво» зборшчыкаў, бо самы час нарыхтоўваць травы. Але зараз клопат — аб [illegible]: надышла пара збору каранёў і карэнішчаў. Вось табліца, з якой бачна, што трэба капаць:

Расліны	Від сыравіны	Час нарыхтоўкі па месяцах (веснавыя і асеннія) 3	4	5	6	7	8	9	10
Алтэй лекавы	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Аралія	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Бадан таўсталісты	Карэнішча	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Барбарыс	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Валяр'ян	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Драсён змяіны	Карэнішча	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Дзівасіл	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Рагулькі	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Ісоп	Трава	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Крапіва	Лісце	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Лязуея	Карэнішча	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Першацвет	Карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Радыёла	Карані і карэнішча	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Шчаўе	Карані і карэнішча	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Элеўтэракок	Карэнішча, карані	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]

Цяпер пра правілы нарыхтоўкі і сушкі сыравіны. Выкопваць, калі надземная частка закончыць сваё развіццё і пажоўкне. Можна, як відаць з табліцы, гэту работу зрабіць і вясною, калі толькі-толькі сыдзе снег, а вегетацыя яшчэ не пачалася [illegible].

Усё выкапанае адразу ж памыць у чыстай праточнай і халоднай вадзе. Ці аддзяляць сцяблінi? Безумоўна. Бракаваць карані, якія захварэлі (можна выразаць толькі пашкоджаныя месцы). Асобныя карані можна і не мыць, а толькі пачысціць, выдаліўшы ўвесь бруд.

Буйныя карані і карэнішчы разрэзаць на часткі, разлажыць на свежым паветры для падвяльвання. Гэта займае гадзіны дзве-тры. Пасля іх сушыць у духоўках і печах. Правілы такія ж, як і для сушкі яблыкаў. Найлепшая тэмпература ў межах 60 градусаў.

Гатовыя карэнішчы і карані правяраць на «спеласць». Калі яны пры згінанні паддаюцца нашым намаганням і не ломяцца, трэба яшчэ сушыць. Абавязкова павінны ламацца!

Захоўваць у каробках з кардону, мяшочках з тканіны, слоіках са шкла з накрыўкамі. Увесь час праглядаць. Тэрмін захоўвання — год ці, ў крайнім выпадку, — тры.

Адзін рэцэпт для амаладжэння. Нарыхтоўка — радыёла.

Яна стымулюе дзейнасць цэнтральнай нервовай сістэмы. Лекі з гэтай расліны істотна паляпшаюць фізічны стан чалавека, яго працаздольнасць. Пры неўрозах нармалізуецца сон. Абавязкова павышаецца апетыт, знікаюць болі ці «тамленні» ў сэрцы. Прэпараты дзейсныя супраць прастудных захворванняў. Ёсць небяспека! Хворыя з павышаным ціскам крыві не павінны прымаць радыёлу. Нельга карыстацца ёю ў час нервовага стрэсу, нейкага ліхаманкавага стану.

Абавязковая кансультацыя доктара!

Сам прэпарат рыхтуюць так. 50 г дробных сухіх частак заліваюць бутэлькай (0,5 л) 40-працэнтнага спірту (чыстага!) і настойваюць два тыдні ў цёмным і цёплым месцы, час ад часу патрэсваючы бутэльку.

Прымаць па 20—30 кропель тры разы на дзень за 30 хвілін да яды.

Вельмі сталым і схільным да нечаканага павышэння ціску крыві людзям прымаць па 5 кропель тры разы на дзень. Пад наглядам доктара. Пры добрых выніках павялічваць дозу ў два разы, даводзячы паказчык да 10 кропель. Не больш!

ШТО ПАТРЭБНА ДРЭВАМ?

Пладовыя дрэвы і ягадныя кусты не патрабуюць аднолькавых умоў для свайго развіцця. Маецца на ўвазе састаў глебы, рэльеф мясцовасці, перапады тэмператур, абарона ад лютых вятроў, шмат яшчэ чаго.

Для яблыні найбольш падыходзяць сугліністыя і супясчаныя глебы. Яны некалькі гадоў запар паляпшаліся гноем ці кампостам. Грунтавыя воды залягаюць глыбока. Але і «сухіх» умоў дрэвы не выносяць. У раёне залягання каранёў дастаткова цёпла. Стабільная і вільготнасць паветра.

Добра, калі восенню ўмерана суха. Тады яблыня лепш падрыхтоўваецца да зімы. Усе яе органы (а найбольш пупышкі) сфарміраваны, закладзена база для наступнага года.

Груша лепш развіваецца на гліністых і сугліністых глебах (іх прынята называць цяжкімі). Даступнымі рэчывамі для сілкавання забяспечаны спаўна.

Груша любіць паўднёвыя схілы, бо там больш цяпла. Але не суха, бо на глебах з малымі запасамі вільгаці дрэва будзе расці запаволена, увесь час адставаць ад графікаў, урэшце дасць плады нізкай якасці. Не выносіць груша розных упадзін, роўных мясцін, дзе гуляе халодны вецер. Абавязкова майстраваць абарону з высокіх дрэў ці пабудоў. Яшчэ груша не любіць вельмі шчолачных глебаў. Як не выносіць і блізкага залягання падземных вод.

Чарэшня добра развіваецца на тых жа гліністых глебах, што і груша. Але яны павінны быць яшчэ больш цёплымі. З «харчу» перавагу аддае кальцыю, вядома, пры дастатковай колькасці азоту, фосфару і калію.

Чарэшня можа развівацца і на супясчаных глебах. У час копкі ям класці адзін-два слаі гліны, а яшчэ лепш сапрапель ці іл.

Менш патрабавальная да «месцажыхарства» вішня. Але штогадовыя высокія ўраджаі магчымы толькі на акультураных глебах.

Сліва, як і чарэшня, вельмі патрабавальная да кальцыю. Вядома, любіць цяпло.

Усе ягаднікі жадаюць расці на добра акультураных глебах, чыстых ад пустазелля, багатых на гумус. Чырвоная і белая парэчкі лепш растуць на цёплых схілах. Чорная парэчка праяўляе цікавасць да рачных берагоў. Там нізка і, значыць, няма пагрозы засухі. Маліна і ажына пераносяць нават лёгкі паўцень, стабільна даючы добры ўраджай.

ТЭМПЕРАТУРА... ГАДУЕ ПАРСЮЧКОЎ

Набліжаецца перыяд масавага забою свіней. Звычайна пік такой работы супадае з першымі ўстойлівымі пахаладаннямі. У народзе пра такую пару кажуць, што зіма яшчэ не ўвайшла, а восень яшчэ не выйшла з сядзібы.

У такі час парсючкам ды свінкам даецца найлепшы корм. Як жа інакш — яны штодня павінны набіраць ад 350 да 500 грамаў. Толькі ў такім разе будзе бачны плён. Гэта дасягаецца многімі фактарамі. У тым ліку і... тэмпературай у хлеўчуку. Цеплыня павінна быць увесь дзень, у любую пару — летам, восенню, зімой. Гарачыня на вуліцы — у свінарніку халаднавата; лютуе мароз — у памяшканні тэрмометр паказвае ўстойлівае цяпло вышэй за сем градусаў.

На пачатку адкорму парсючка пажадана мець тэмпературу-ідэал — 21 градус цяпла. Тады корм ідзе напрамую на нарошчванне «мускулаў» і сала. А калі тэмпература знізілася да 15 градусаў? У такім разе трэба больш расходаваць кармоў на прывагу і яшчэ на награванне цела. І расход кармоў узрастае істотна — больш як на трэць! Калі тэрмометр паказвае 10 градусаў, рыхтуй кармоў амаль удвая больш у параўнанні з ідэалам у 21 градус. Адсюль выснова: трэба ставіць свінню на адкорм восенню ці вясной, калі тэмпературны рэжым найбольш зручны.

Прывядзём прыклады самых рацыянальных паказчыкаў тэмпературы. У памяшканнях для супаросных матак — 15,5—21 градус; для парасят, якія толькі-толькі з'явіліся, — 26,6—32; для падсвінкаў (22—58 кг) — 18—21; для адкорму — 15,5—21 градус. Абавязковая вентыляцыя. Жывёла лепш адчувае сябе ў халаднаватых памяшканнях з трывалым прытокам паветра, чым у цёплых з застойным паветрам. Выпускаюць жывёлу на прагулкі. Для гэтага ля хлеўчука агароджваюць спецыяльныя пляцоўкі.

Выдатны вынік даюць памяшканні, дзе столь добра ўцеплена саломай. Тая ж салома (абавязкова сухая і дробна парэзаная) кладзецца ў спальнае месца парсючка. Той вельмі любіць «накрывацца» менавіта такой «коўдрай». Зверху толькі лычык, усё астатняе ў саломе. Яшчэ лепш, калі на адкорме не адна асобіна, а дзве ці нават болей. Яны самі сябе саграваюць, весела гуляюць, лепш з'ядаюць кармы.

ПЕРАПІСКА З ЧЫТАЧАМІ

НОВІКАВУ Аркадзю, г. Мінск

Аркадзь Арцёмавіч, сліву можна перапрышчапіць ранняй вясною (калі дрэва «спіць»). Метады самыя розныя. Аб гэтым падрабязна расказана ў нашай брашуры «Дары саду». Яна прадаецца ў магазінах Мінска: «Аграхімік» (вуліца Чырваназорная) і «Сельгаскніга» (праспект Скарыны — перакрыжаванне з вуліцай Валгаградскай).

Аб прышчэпках шмат літаратуры. Звярніцеся ў любую бібліятэку.

Заметка аб самых простых аперацыях па прышчэпліванню чаранкоў будзе надрукавана ў «Звяздзе» ў лютым-сакавіку. Заставайцеся нашым сябрам!

Яўгеніі ПЛАКСА, г. Нясвіж.

Дзякуй за пісьмо. На паштовым пераводзе Вы сапраўды не ўказалі, якія брашуры збіраліся набыць. Цяпер усё зразумела. Удзячныя за цёплыя словы ў адрас аддзела «Сядзіба».

Напамінаем усім, хто хоча набыць брашуры для агароднікаў-садаводаў (умовы змешчаны ў мінулым выпуску «Сядзібы»): дакладна запаўняйце ніжнюю палавіну пераводаў. Указвайце дакладна і разборліва свой адрас з індэксам і прозвішчам, з імем і імем па бацьку, пералік брашур (іх нумары), якія жадаеце набыць. У самым нізе пастаўце дату адпраўлення (для кантролю).

Папярэдніх пісьмаў не пішыце, квіткі сваіх пераводаў не дасылайце. Гэта ваш дакумент! Не рабіце лішніх трат. Як толькі мы атрымаем перавод, вышлем брашуры (затрымка дзень ці два).

ЧАЛАВЕК СЯРОД ЛЮДЗЕЙ

Канстанцін СЯЛЬЧОНАК:

«ЦІ ВЕДАЕМ МЫ, ШТО ТВОРЫЦЦА НА ПРАСТОРАХ НАШАЙ ДУШЫ?..»

На пытанні «Звязды», звязаныя з адносінамі паміж людзьмі, адказвае вядомы і папулярны астрапсіхолаг

— Спачатку, Канстанцін Уладзіміравіч, хацелася б прадставіць вас нашым чытачам...

— Гадоў некалькі таму апублікаваў у «Звяздзе» артыкул аб Чарнобылі, з якім не па маёй волі звязала мяне наша агульная страшэнная бяда. На працягу трох гадоў штотыдня выступаў па Беларускім радыё. Цяпер па запрашэнню Беларускага тэлебачання гэтак жа актыўна ўдзельнічаю ў рэгулярнай перадачы «Пазнай сябе». Так што ўсім, хто цікавіцца праблемамі ўнутранага свету чалавека, маё прозвішча, думаю, павінна быць вядома.

Што датычыць мяне асабіста, то мае жыццёвыя вехі такія. Закончыў аддзяленне педыятрыі Мінскага медыцынскага інстытута. Затым два гады служыў у арміі. Там быў палкавым урачом, загадчыкам медчасткі ў адной з вайсковых часцей. У свой час на працягу трапіў у Чарнобыль, дзе ўвогуле прыйшоў да высновы: медыцына ў пэўным сэнсе не можа вырашыць праблем, што стаяць перад ёй, калі не ўключыць, як кажуць, чалавечы фактар.

Чалавек — гэта не цела і душа, а душа ў целе. Калі не ўнікнуць ва ўнутраны свет пацыента, не дапамагчы яму разабрацца са сваімі ўнутранымі праблемамі, не акцэнтаваць яго ўвагу на шляхах пераадолення нейкіх цяжкасцей (ведаю гэта як урач), то лячыць чалавека дарэмна.

Вось адсюль і ўзнікла ў мяне натуральная цікавасць да практычнай псіхалогіі. Пасля арміі мне ўдалося папрацаваць на ўчастку паліклінічным урачом, і гэта яшчэ больш пераканала мяне ў тым, што шлях да чалавека, да яго вылячэння закрыты. І прыйшло гэта на думку таму, што я даволі даўно цікавіўся, займаўся практычнай астралагічнай псіхалогіяй, г. зн. навукай аб структуры душэўных працэсаў, аб тым, **што адбываецца на прасторах чалавечай душы.**

Тады, у 1988 годзе, калі вярнуўся з арміі, вырашыў цалкам прысвяціць сябе гэтаму занятку, аб чым зараз нікольні не шкадую. Хоць, праўда, цяжкасцей тут шмат.

— І з чым яны перш за ўсё звязаны?

— А з тым, што ніхто не ведае, што такое практычная псіхалогія, і ніхто не хоча разумець, што такое астрапсіхалогія. І тая ж астрапсіхалогія ў нейкім сэнсе прынцыпова не прымаецца нашымі людзьмі, нашым грамадствам наогул. Таму што лічыцца — гэта не навука, а антынавука, нават ілжэнавука. А вось шматгадовы вопыт (больш чым 15 гадоў) вывучэння астрапсіхалогіі мне асабіста даказаў — гэта вельмі важная, сур'ёзная дысцыпліна. Яна ў многім можа дапамагчы чалавеку, прычым незалежна ад узроўню яго праблем, ад глыбіні цяжкасцей, можа дапамагчы самастойна з імі разабрацца і знайсці шлях да вылячэння.

На жаль, у нас практычную псіхалогію, як і астрапсіхалогію, разумеюць як служанку. На практыцы гэта выглядае прыкладна так: я прыйшоў, паставіў перад табой праблему, ты яе за мяне вырашы, а я пайду далей здаровы і шчаслівы.

Псіхолаг не прыслужнік, а настаўнік, які спрабуе дапамагчы іншаму (свайму кліенту, пацыенту) адшукаць тое нераўнаважнае, тыя ўнутраныя цяжкасці, якія перашкаджаюць яму шчасліва жыць, навучыць іх пераадольваць, у іх разбірацца. Цяпер я займаюся гэтым па меры сваіх здольнасцей, сіл. Спадзяюся, што ў той ці іншай ступені магу быць карысным і вашым чытачам.

— Дзякуй за такую прапанову. Але псіхалогія, як і астрапсіхалогія, не могуць існаваць самі па сабе без пэўных адносінаў. Давайце аб іх і пагаворым, перш за ўсё пра адносіны паміж людзьмі...

— У нас, на жаль, чамусьці лічыцца, што можна разабрацца ў адносінах паміж двума чалавекамі, не разбіраючыся ў душы кожнага з іх. Астрапсіхалогія лічыць: без вывучэння кожнага канкрэтнага ўдзельніка адносінаў, яго гараскопа, душэўнага жыцця, высветліць, што адбываецца ў адносінах, і наладзіць іх — немагчыма. Усё гэта застанецца пустым гукам. Скажам, адносіны паміж мужчынам і жанчынай — гэта абстракцыя. А вось адносіны паміж канкрэтным мужчынам і канкрэтнай жанчынай у канкрэтны час — гэта ўжо нешта прадметнае, што можна вывучаць.

— Скажыце, Канстанцін Уладзіміравіч, як складваюцца адносіны паміж людзьмі, ад чаго яны залежаць?

— Перш за ўсё складваюцца заканамерна. Праўда, гэта вельмі рэдка разумеюць людзі. Яны жэняцца і выходзяць замуж не выпадкова. Так? Дзеці ў сем'ях паяўляюцца не выпадкова. Чалавек выбірае той ці іншы занятак, прыходзіць на работу ў сваю арганізацыю, установу таксама не выпадкова. Можа быць галоўнае, што астрапсіхалогія здольна прыўнесці ва ўсведамленне сучаснага чалавека, — гэта разуменне таго, што ўсё на свеце бывае не выпадкова. І калі мы пачынаем зыходзіць з такога тэзіса, то нам ужо не хочацца лянотна парываць адносіны, нават палічыўшы, што яны не ўдаліся. Астрапсіхалогія сцвярджае: усё, што адбываецца ў жыцці чалавека і павінна быць так або інакш вырашана.

Сучасная цывілізацыя, як ні шкада, прынесла ў наша ўсведамленне крыху іншыя ўяўленні. Людзі памылкова лічаць, што ёсць правільныя адносіны, і ёсць дрэнныя, якіх, праўда, можна пазбегнуць. Інакш кажучы, ёсць тое, з чым нам прыемна мець справу, а ёсць і тое, што нам не падабаецца. І тое, як пацвярджае астрапсіхалогія, што нам недаспадобы, дзе мы сутыкаемся з канфліктамі, да чаго не ляжыць душа, у рэальнасці і з'яўляецца праблемнай зонай.

— Цікава, як у ёй чалавеку сябе адчуваць і паводзіць?

— Ён здольны вырашаць свае праблемы, адказваць за свае ўчынкі. Згодна з боскімі і чалавечымі законамі, калі мы ўсе будзем прытрымлівацца нейкіх законных установак, то ўвогуле наша жыццё можна палепшыць, мы цалкам здольныя пераадолець усе цяжкасці і пабудаваць нармальнае жыццё.

— Добра, уявім сабе, што мы ўсе будзем прытрымлівацца, скажам, Боскага закона. Тады што?

— А тут узнікае пытанне, як зрабіць так, каб мы, людзі, маглі ўбачыць у бліжнім сваім брата і сястру, каб чалавеку наогул прыйшла ў галаву ідэя маральнай адказнасці перад пакаленнямі...

— Наша чытачка з г. Драгічына, заслужаная настаўніца Рэспублікі Беларусь Валянціна Васільеўна Чэчка зазначыла ў сваім допісе ў рэдакцыю: «Калі ты сам жабрак, дапамажы яшчэ больш беднаму жабраку — і Бог табе таксама дапаможа. Калі б усе мы так рабілі, якім гарманічным і прыгожым было наша жыццё. Але ў рэчаіснасці атрымліваецца інакш...» Што тут можна сказаць?

— Я згодзен з аўтарам гэтага пісьма ў тым, што гэта трэба рабіць і так яно павінна быць. Уся праблема ў тым, як гэта зрабіць? Пагадзіцеся: пытанне тут намнога больш складанае, чым здаецца гэтаму педагогу. І асноўная праблема вось у чым: каб быць маральна здаровым, як ні дзіўна, трэба вельмі шмат ведаць пра сябе, сур'ёзна сябе вывучаць. А яшчэ неабходна гэтак жа ведаць пра тых, з кім побач існуеш, па якіх законах з імі ўзаемадзейнічаеш.

Мы, напрыклад, ведаем, як трэба правільна дзейнічаць, але далёка не заўсёды так дзейнічаем самі.

— Відаць, адносіны ў немалой ступені залежаць і ад таго, што ўяўляе сабой асоба. Вядомы нямецкі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Генрых Бёль зазначыў: «Маштаб чалавечай асобы не залежыць ад таго, у якім сацыяльным свеце яна існуе...»

— Я таксама так лічу. Зыходным у змяненні жыцця і ў тых жа адносінах з'яўляецца сам чалавек. Хочам мы таго ці не, але можна заглушыць і маштабную асобу, задзяўбці яе. Людзі нараджаюцца рознымі. Адны — слабымі, раздражняльнымі, вельмі нецярплівымі да іншых. Другія — нягледзячы на жыццёвыя віхуры і складанасці, адразу дастаткова моцнымі, цярплівымі да ўсяго, перш-наперш да людзей. І чалавечая мудрасць прыводзіць да думкі: зыходным у змяненні ўмоў жыцця з'яўляецца сам чалавек. У самыя цяжкія часы заўсёды знаходзяцца людзі надзвычай высокага палёту і вялікай сілы. У той жа час нямала мярзотнікаў можа жыць у вельмі багатым, забяспечаным грамадстве. Хоць тут няма механічнай сувязі, нам часта гавораць: будзе моцная эканоміка — усё будзе добрае, цудоўнае. Так, лепшых прымет і людзей стане больш, але гэта зусім не апраўданне таго, што я быў дурнем таму, што вакол было дрэнна, панавалі разруха і беднасць. Ёсць, на жаль, асобы, якія вельмі моцна ад такога «дабрабыту» залежаць і яго выкарыстоўваюць з асабістай выгадай.

Ніхто цяпер фактычна не цікавіцца самім сабой, самым важным у сабе. Наконт медыцыны гэтага не скажаш. Калі ў чалавека нешта забалела, ён адразу бяжыць да ўрача. А вось калі ў яго баліць душа, чалавек не ведае, што рабіць. Зусім не выпадкова пытанні псіхалагічнай культуры, самавыхавання, выхавання сваіх дзяцей — неараная цаліна. Праўда, у пачатку нашумелай перабудовы нібыта ўзяліся за гэтыя праблемы, але хутка пра іх забыліся і закінулі.

У гэтым, прашу прабачэння, нямала вінаваты і сродкі масавай інфармацыі. Скажам, вельмі цяжка, амаль немагчыма, у любой газеце, часопісе завесці пастаянныя калонкі, у якіх спецыялісты-псіхолагі давалі б свае практычныя парады. А яны ў многім маглі б замяніць і лекцыі, і практычныя кансультацыі медыкаў, і нават лячэбную прафілактыку.

У заключэнне хачу паўтарыць: псіхалогія — гэта ў нейкім сэнсе святая навука, гэта духоўныя веды. І калі людзі перастаюць імі цікавіцца, то гэта дрэнная прымета. А яна сведчыць не толькі аб глыбокім сне народа, але і аб нейкай нікчэмнай раўнадушнасці да сваёй асабістай душы, да жыцця душ бліжэйшых людзей.

Гутарыў Іван БРАЛКА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 25 верасня

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль. **7.50** Эканамікст. **8.00** Навіны. **8.15** «Наталі маю самоту». Дак. фільм. **8.30** Камп'ютэрны палігон. **9.00** Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 8-ы клас. Ефрасіння Полацкая і яе жыццё. **9.30** «Дзяжурная аптэка». **10.30—11.30** Відзьма-нявідзьма. **15.00** Навіны. **15.10** «Фліпер». Тэлесерыял. **15.55** «Сядзіба». Праграма для дачнікаў. **16.30** Творцы. Літаратуразнаўца Юльян Пшыркоў. **16.55** Крэда. Указы аб падаткаабкладанні і цэнаўтварэнні. **17.15** Госці ў хату. «Гульні народаў свету». **17.45** «Востры вугал». Прававая праграма па пісьмах гледачоў. **18.15** Музычны антракт. **18.25** Эканамікст. **18.35** «Тройчы па аднаму». Музычная перадача MTV. **18.50** Навіны (з сурдаперакладам). **19.00** Рэферэндум: шчырая размова. **19.35** «Дзяжурная аптэка». **20.35** «Хто гэта?» Тэлегульня. **20.40** Калыханка. **21.00** Панарама. **21.55** Аўта-парк. **22.10** Па старонках тэлемарафона «Памяць». Мемарыялу «Брэсцкая крэпасць-герой» — 25 гадоў. **23.50** Супергол. **0.20** Навіны.

ГРТ

11.00 Навіны. **11.10** У эфіры тэлерадыёкампанія «Мір». **11.55** Кінаэпапея «Ціхі Дон». 1-я серыя. **13.40** Мультфільм. **14.00** Навіны (з сурдаперакладам). **14.20** «Горад сабак». **14.45** Кактус і К. **14.55** До-мі-соль. **15.10** Кліч джунгляў. **15.40** «Элен і хлопцы». **16.05** Тэт-а-тэт. **16.30** «Вакол свету». **17.00** Навіны. **17.20** «Новая ахвяра». **18.10** Гадзіна пік. **18.35** Адгадай мелодыю. **19.00** Тайны еўрапейскай разведкі ў аўтарскай праграме Эльдара Разанава. **19.45** Добрай ночы, малышы! **20.00** Час. **20.40** «Шастаковіч смяецца». Музычны фільм. **21.00** Кубак свету «Майстар-ралі-96». Парыж—Масква— Байканур—Улан-Батар. **21.20** Футбол. «Аякс» (Галандыя) — «Грасхоперс» (Швейцарыя). **23.20** Навіны. **23.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд 7 матчаў.

Расія

7.20 Ранішні экспрэс-2. **7.50** У свеце капіталу. **8.00** Рэтра-шлягер. **8.25** Дарагая рэдакцыя. **9.00** «Санта-Барбара». **9.50, 23.20** Тавары — поштай. **10.20—12.00** «Авадзень». Маст. фільм. **16.20** Блакнот. **16.35** «Чэленджэрс». Серыял для падлеткаў. **17.05** Залежыць ад цябе. **17.20** Тэлечасопіс «Здароўе». **17.30** А. Пугачова ў праграме «Астралогія кахання». **18.00** Клуб губернатараў. **18.25** Лідэр-прагноз. **19.30** «Санта-Барбара». **20.30** Аляксандр Разенбаум у праграме «Бочка мёду». **21.05** Ад фортэ да піяна. **21.35** «Гамлет». Маст. фільм. 2-я серыя. **23.30** Музыка ўсіх пакаленняў. **23.45** «Хто на што здатны». Конкурсная праграма. **23.55—0.20** Не спі і глядзі. «Другое дыханне».

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 15.55, 18.55, 21.55, 23.15 Інфарм ТБ. **12.10** «Першае каханне». Серыял. 142-я серыя. **13.00** Тэрмін адказу — сёння. **13.30** Парады садаводам. **13.40, 20.40** Тэлеслужба бяспекі. **14.10** «Дэмпсі і Мейкпіс». Серыял (ЗША). **15.00** Балет «Уваскрашэнне». **15.25** «На біс». Зураб Саткілава. **15.40** Скарбы Пецярбурга. **16.10** Асабістая справа. **16.35** «Філасофія па Філу». Серыял для падлеткаў. **17.00** Мультфільм. **17.05** «Солці». 11-я серыя. **17.35** Паказвае Ленінградская АТК. **18.40** Вялікі фестываль. **19.15** Спорт. **19.20** «Першае каханне». Серыял. **20.10** Толькі без панікі. **20.50** Спартыўны агляд. **21.00** «Дэмпсі і Мейкпіс». Серыял. (ЗША). **22.15—23.20** «Дым». Маст. фільм. 2-я серыя.

НТБ

6.00, 9.00, 13.00 Сёння. **6.20** «Містэр Ніхто, або Небяспечныя гульні». Серыял. **7.10** Маст. фільм «Забойства сярод сяброў» (ЗША). **8.40** Маст. фільм «Музыканты». **9.20** Маст. фільм «Цудоўныя гады». **10.05** Дак. фільм. **11.00** Маст. фільм «Дарагі тата». **12.40** «Доктар Угол».

Расійскія універсітэты

14.40 Д. Шастаковіч. Сёмая сімфонія. Дакументы. Роздумы. **15.25** Мультфільм. **15.35** Руская мова. Сакрэты арфаграфіі. Урок 1-ы. **16.00** Музычныя навіны. **16.10** «Брадвей» нашага юнацтва». Дак. фільм А. Габрыловіча. **16.40** Навіны.

НТБ

17.00 Мультсерыял. **17.30** Жаночыя гісторыі. «Яе першы мужчына» (Італія). 4-я серыя. **18.00, 21.00, 23.00** Сёння. **18.35** Герой дня. **19.00** Клод Брасер у фільме «Вайна паліцый» (Францыя). **20.45** «Доктар Угол». **21.35** Фестываль міні-серыялаў. «Востраў Эліс: чысцілішча для эмігрантаў» (ЗША). 1-я серыя. **22.30** Часінка. **23.20** Сусветная шахматная Алімпіяда. **23.25** Такое спартыўнае жыццё. **23.55** Кафэ «Абломаў».

Восень. Родныя прасторы.

Фота Уладзіміра ФЯДОТАВА.

ВІНШАВАННІ

*Віншуем з днём нараджэння **Алёну Леанідаўну Радзюк.** Жадаем здароўя, шчасця.*

Калектыў Казлоўіцкага сельскага Савета.

*Сардэчна віншуем з 15-годдзем дарагога ўнука **Сашу Захарэвіча.** Жадаем усяго найлепшага: моцнага здароўя, поспехаў у вучобе, добрых сяброў.*

Дзядуля і бабуля Захарэвічы з Пастаў.

*Віншуем з днём нараджэння **Наташу Варанковіч.** Жадаем моцнага здароўя і поспехаў у вучобе.*

Бацькі і брат Варанковічы з в. Ішкалдзь.

*Віншую з днём нараджэння **Алу Мікалаеўну Сянькову.***

Бацька.

*Віншуем **Галіну Фёдараўну і Мікалая Аляксандравіча** з днём нараджэння. Жадаем вам заўжды жыць у шчасці і радасці і ніколі не ведаць гора.*

Дачка Алена, сыны Павел, Арцём і бабуля Лена з в. Кабанаўка Жлобінскага раёна.

Згубленае пасведчанне аб праве на льготы № 181344 серыі АА, выдадзенае на імя **Уладзіміра Андрэевіча Курчэні,** лічыць **несапраўдным.**

Post Factum

Гэты дзень у гісторыі

25 верасня 1765 года нарадзіўся Міхал Клеафас Агінскі, дзяржаўны дзеяч, кампазітар, аўтар славутага паланеза «Развітанне з Радзімай».

25 верасня 1897 года з'явіўся на свет Уільям Фолкнер, амерыканскі пісьменнік. Яго пяру належаць такія раманы, як «Асабняк», «Шум і ярасць», «Горад». Асноўныя матывы творчасці — эпічна асэнсаваныя карціны свету, дзе чалавек процістаіць абставінам.

25 верасня 1906 года нарадзіўся Дзмітрый Шастаковіч, рускі кампазітар, піяніст, педагог, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы.

У гэты дзень **у 1913 годзе** нарадзіўся вядомы беларускі паэт Сяргей Грахоўскі. Друкуецца з 1926 года, аўтар зборнікаў «Дзень нараджэння», «Памяць», «Зазімак», «Асеннія гнёзды» і многіх іншых, прайшоў скрозь сіта сталінскіх лагераў.

25 верасня 1920 года нарадзіўся Сяргей Бандарчук, славуты савецкі акцёр і рэжысёр, народны артыст СССР, аўтар кінаэпапеі «Вайна і мір».

25 гадоў назад — **25 верасня 1971 года** адкрыўся мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Ён створаны на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці дзеля ўвекавечання подзвігу яе абаронцаў.

Народны каляндар

Сёння — *Фёдар.* На Фёдара лету канец — восені пачатак. *«Не ўсякае лета да Фёдара дацягне»,* сцвярджае народная прыказка. Пачынаюцца восеньскія дажджы.

Дзесьці на белым свеце

Дваццацідвухгадовая жыхарка французскага гарадка Ля-Рашэль Карына Лефеўр нядаўна па нейкай нязначнай бытавой патрэбнасці звярнулася ў мэрыю свайго горада. І вельмі здзівілася таму, што там даведалася.

Аказалася, што яна «развядзёнка», а да гэтага чатыры гады была замужам за зусім незнаёмым ёй афрыканцам з Марока. Карына прыгадала, што якраз чатыры гады таму ў яе ўкралі сумачку з дакументамі. Згубленыя дакументы ёй замянілі новымі. Ну а старыя, як бачым, спатрэбіліся людзям, якія жадаюць любым чынам атрымаць французскае грамадзянства. Стаўшы «мужам» Карыны Лефеўр, мараканец аформіў грамадзянства, а затым развёўся з жонкай-завочніцай. Аперацыя ў прынцыпе ў Францыі нескладаная, але падпадае пад некаторыя артыкулы Крымінальнага кодэкса. А таму паліцыя вырашыла знайсці «мужа» і задаць яму некалькі пытанняў.

Неверагоднае, загадкавае...

«Чула і шмат чытала аб так званых прарочых снах, але ніколі раней сур'ёзна не ставілася да падобных паведамленняў, нават у самых «сур'ёзных» газетах, — піша Галіна Папова, урач з пасёлка Уздынь Новасібірскай вобласці. — І ўжо ніколі не думала, што такое прароцтва можа адбыцца са мной...

Сплю і бачу ў сне, што ляжу я на сваім ложку, а на мяне са столі падае вялізны кавалак тынкоўкі. Ды так усё яскрава ўбачылася, што я тут жа прачнулася. І адразу ж пачула на кухні гук, як быццам з-пад крана моцным патокам б'е вада. «Залье ўсю кватэру» — падумала, тут жа ўсхапілася, пабегла на кухню — але не, кран закрыты, ніякай вады няма. І тут я пачула іншы гул, як быццам штосьці рухнула.

Вярнулася ў спальню і ахнула: на маёй падушцы ляжыць такі вялізны кавалак тынкоўкі, што калі б ён упаў мне на галаву, імгненна забіў бы.

Выходзіць, што прарочы сон папярэдзіў мяне аб смяротнай небяспецы літаральна за паўхвіліны да бяды і тым самым захаваў жыццё. Ну як тут не верыць у цуда?!.»

Расказваюць, што...

Гэта было ў 1943 годзе, у час Ялцінскай канферэнцыі.

Міністр замежных спраў Вялікабрытаніі Ідэн напісаў Чэрчылю запіску. Прачытаўшы яе, кіраўнік англійскага кабінета спаліў паперку. Напісаў адказ і працягнуў Ідэну. Той, прачытаўшы цыдулку, дробна разарваў яе і выкінуў у карзіну.

Пасля пасяджэння чэкісты сабралі кавалачкі паперкі і аднавілі запіску Чэрчыля. Там было напісана: «Не хвалюйцеся, стары ястраб не выпадзе з гнязда».

Як ні біліся савецкія дэшыфравальшчыкі над гэтым знешне нескладаным тэкстам, нічога не зразумелі ў ім. А праз шмат гадоў пасля вайны, знаходзячыся з візітам у Англіі, Мікіта Хрушчоў сустрэўся з былым прэм'ерам. «Мы доўга спрабавалі зразумець сэнс вашай запіскі, але так і не дабіліся гэтага. Зараз з «вялікай тройкі» вы засталіся адзін. Можа, адкрыеце падтэкст гэтай фразы?» Рассмяяўшыся, Чэрчыль сказаў: «У мяне тады расшпілілася шырынка. Пан Ідэн папярэдзіў мяне, а я яго заспакоіў»...

Цікава

У людзей ёсць шмат спосабаў успрымання навакольнага свету: у адных тут асноўную ролю іграе зрок (такіх людзей называюць візуаламі), іншыя робяць упор на слыхавыя адчуванні (аўдыялы), трэція аддаюць перавагу дотыку (кінестэтыкі).

Задайце свайму субяседніку якое-небудзь пытанне, скажам: «Якая ў цябе самая яркая падзея гэтага года?» Калі ён, перш чым адказаць, паглядзіць налева ўверх — перад вамі візуал; направа ўніз ці прама ўніз — вы размаўляеце з кінестэтыкам; а калі правядзе вачамі па гарызанталі справа налева — то гэта аўдыял. Уявім, што субяседнік глядзіць налева ўніз — гэта можа азначаць, што ён заняты ўнутраным дыялогам, узважваючы свой адказ, або не вельмі вам давярае. Асаблівы выпадак — погляд направа ўверх і апусканне вачэй па дыяганалі налева ўніз: будзьце пільнымі — вас хочуць падмануць. Менавіта такі напрамак руху вачэй, як лічаць псіхолагі, сведчыць аб «канструяванні адказу», прасцей кажучы — чалавек выдумляе.

Анекдот

— Кожны раз, як я пачынаю спяваць, ты выходзіш на балкон, — звяртаецца цешча да зяця. — Гэта трэба расцэньваць як тваю дэманстрацыю таго, што табе не падабаюцца мае спевы?

— Безумоўна, падабаюцца, — цэдзіць праз зубы зяць. — Але ж не трэба даваць суседзям падставу думаць, быццам я вас збіваю...

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Кабінет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».
Рэгістрацыйны нумар 1.

Першы намеснік галоўнага рэдактара М. МІХАЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220013, гор. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: [illegible]

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. [illegible]

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79. Тыраж 91852. Індэкс 63850. Зак. № 6183. Выходзіць 250 разоў на год. Нумар падпісаны ў 20.15.